Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
УА “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

В.У. Таранеўскі

# ГАРАДСКОЕ ЛЕТАПІСАННЕ БЕЛАРУСІ XVII–XVIII СТ.: “ВІЦЕБСКІ ЛЕТАПІС” М.ПАНЦЫРНАГА І С.АВЕРКІ

Вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей універсітэта

Віцебск - 2012

Репозиторий ВГУ

ББК 83.3(4Бел)4
УДК 82-94:94(476) “16-17”
Г 20

Друкуецца рашэннем рэдакцыйна-выдавецкага савета УА “Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава”

Аўтар : старшы выкладчык кафедры беларускай літаратуры УА “Віцебскі дзяржаўны універсітэт імя П.М.Машэрава” Таранеўскі В.У.

Рэцэнзент: к.ф.н., дацэнт Харошка Г.П.

Таранеўскі В.У.

Г 20 Гарадское летапісанне Беларусі XVII–XVIII ст.: “Віцебскі летапіс” М. Панцырнага і С. Аверкі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей універсітэта. – Віцебск : Выд-ва Віцеб. дзярж. ун-та, 2012. – 80 с.

Вучэбны дапаможнік асвятляе гісторыю стварэння “Віцебскага летапісу” М. Панцырнага і С. Аверкі, яго месца ў кантэксце гарадскога летапісання Беларусі XVII–XVIII стст., фактаграфічную і мастацкую вартасць. Вучэбны дапаможнік адрасаваны студэнтам філалагічных спецыяльнасцей універсітэта і прыхільнікам старажытнай літаратуры.

- Выдавецтва УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2012.

Репозиторий ВГУ

ЗМЕСТ


I. УВОДЗІНЫ. З ГІСТОРЫІ ЛЕТАПІСАННЯ КІЕЎСКАЙ РУСІ.....................4

II. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “ЛЕТАПІСАННЕ КІЕЎСКАЙ РУСІ”…………………………………………………………… 6

III. ЛЕТАПІСАННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА……………… ..6

1. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”………………………………………6

2. Летапіс 1446 года (“І-ы Беларускі летапіс”)……………… ……………10

3. “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”……………………12

4. “Хроніка Быхаўца”…………………………………………………………13

IV. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “ЛЕТАПІСАННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА”…………………………….………15

V. БАРКУЛАБАЎСКАЯ ХРОНІКА…………………………………………15

VI. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “БАРКУЛАБАЎСКАЯ ХРОНІКА”……………………………………………………………………….20

VII. “ВІЦЕБСКІ ЛЕТАПІС” МІХАЛА ПАНЦЫРНАГА І СЦЯПАНА АВЕРКІ………………………………………………………………………….21

VIII. ЛЕТАПІС ПАНЦЫРНАГА І АВЕРКІ (ДАДАТАК)…………………..22

IX.ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “ГАРАДСКОЕ ЛЕТАПІСАННЕ: “ВІЦЕБСКІ ЛЕТАПІС М.ПАНЦАРНАГА І С.АВЕРКІ”……………………………………………………………….40

X. ЛІТАРАТУРА…………………………………………………………40


Репозиторий ВГУ

# I. УВОДЗІНЫ. З ГІСТОРЫІ ЛЕТАПІСАННЯ КІЕЎСКАЙ РУСІ

Летапісанне пачынаецца тады, калі народ пачынае ўсведамляць сябе народам. Складанню летапісаў заўсёды надавалася вялікае значэнне, бо летапісы станавілія афіцыйнымі дакументамі, на іх ссылаліся пры рознага роду перамовах, па іх князі даказвалі сваё права на княжанне. Высока цаніліся і людзі, якія маглі "гаварыць" па летапісах, гэта значыць вельмі добра ведалі іх змест.

Летапісцы самі разумелі , што яны складаюць дакумент, які павінен быў захаваць у памяці нашчадкаў тое, чаму яны былі сведкамі. "Да и сие не забвенно будет в последних родах", "Да сущим по нас оставлено", "да не до конца забвенно будет" – пісалі яны. Летапісцы ўкраплялі у свае зводы творы самых розных жанраў – павучанні, сказанні, жыццiя святых, гістарычныя аповесці, легенды і паданні, а таксама біблейныя сюжэты. Дзякуючы прыцягванню такога разнароднага матэрыялу летапіс станавіўся аграмаднай энцыклапедыяй, якая ўключала звесткі пра жыццё і культуру народа, яе стварыўшага. "Калі хочаш аб усім даведацца, прачытай старога летапісца Растоўскага", – пісаў суздальскі епіскап Сімяон у шырока некалі вядомым сачыненні пачатку XIII стагоддзя – у "Кіеўска-Пячэрскім пацерыку".

Кіеўская Русь ў XI – XII стст. ўключала ў свой склад і сённяшнія беларускія землі. Менавіта ў Кіеве, за сценамі Сафійскага сабора нехта найхутчэй з духоўных асоб запісаў упершыню на кавалку пергамента (харціі) слова "В ЛЪТО". Магчыма, яго звалі Лаўрынам а, магчыма, Нестарам. Не так важна. Галоўнае і вельмі хвалюючае, што да нас са старонак летапісаў і сёння даносіцца голас летапісца. Старажытныя летапісцы, як дойліды і жывапісцы, былі вельмі сціплымі і рэдка называлі сябе. Але іншы раз, як бы забыўшыся, яны гавараць пра сябе ў першай асобе: "Аз многие словеса слышал еже и вписал в летописаньи сем". Іншы раз летапісцы ўносілі звесткі пра сваё жыццё: "В тоже лето поставили меня попом", – гэты запіс пра сябе зрабіў святар адноў з наўгародскіх цэркваў Герман Ваята.

Летапісец у летапісе не толькі апавядальнік, ён і суддзя. Ен судзіць па нормах вельмі высокай маралі. Яго пастаянна хвалююць пытанні дабра і зла. Ён то радуецца, то гневаецца, хваліць адных і негатыўна ацэньвае другіх. Інакш, у нашай свядомасці як бы паўстае эпічны вобраз летапісца – мудрага старца, які "все временнобогатства земные не абинуяся показует" і "без гнева" апісвае "всё доброе и нероднае".

Над летапісамі працавалі не толькі летапісцы, але і простыя пісцы. Мы можам уявіць іх па старажытнай мініяцюры: яны сядзяць на "стульце" з падножкай, трымаючы на каленях сувой ці пачак перагнутых у два-чатыры разы лістоў пергамента ці паперы, на якіх яны пішуць. Перад ім стаяць чарнілы і пясочніца. тут ляжыць лінейка, сцізорык для пер'яў і падчысткі няправільных месцаў. На падстаўцы ляжыць кніга, з якой яны спісваюць.

Праца патрабавала вялікай ўвагі, яны працавалі ад ранку да вечара. Ім перашкаджалі стомленасць, хваробы, пачуццё голаду і жаданне спаць. Таму

Рэпазіторый ВГУ

іншы раз яны рабілі прыпісы на палях сваіх рукапісаў, у якіх скардзіліся: “Ох, ох, голова мя болить, не могу писати”. Таму няма нічога дзіўнага, што пісец, дапісаўшы апошнюю старонку, перадае сваю радасць прыпіскай: “Аки заяц рад, сети избег, так рад писец, последнюю страницу дописав”.

Доўгую і вельмі вобразную прыпіску зрабіў летапісец, манах Лаўрын пасля таго, як закончыў сваю цяжкую працу. У гэтай прыпісцы адчуваецца радасць здзейснення вялікай і важнай справы: “Радуется купец прикуп сотворив, и кормчий в отишье пристав, и странник в отечество свое пришед; так же радуется и книжный списатель, дошед конца книгам. Тако ж и аз худый недостойный и многогрешный раб божий Лаврентий мних. А ныне, господа отцы и братья, оже ся где описал или переписал, или не дописал, чтите, исправляя бога деля, а не кляните, занеже книги ветчаны, а ум молод и не дошедл”.

Самы старажытны ўсходнеславянскі летапісны звод, які мы сёння маем, называецца “Аповесцямі былых часоў” (“Се повести времяньных лет, откуду есть пошла Русская земля, кто в Киеве нача первее княжити и откуда Русская земля стала есть”).

Ён даводзіць свой выклад гісторыі да другога дзесяцігоддзя XII стагоддзя, але да нас гэты звод дайшоў толькі ў спісах XIV і наступных стагоддзяў: Іпацьеўскім, Лаўрынаўскім, Сільвестраўскім і Наўгародскім.

Самы старажытны спіс агульнарускага летапісу быў зроблены на пергаміне у XIV ст. Гэта сінадальны спіс Наўгародскага першага летапісу. Зараз ён знаходзіцца у гістарычным музеі ў Маскве. Калісьці ён належаў Маскоўскай Сінадальнай бібліятэцы, адсюль і яго назва.

Цікавым бачыцца і ілюстраваны Радзівілаўскі, ці Кёнісбергскі, летапіс. Адзін час ён належаў беларускім магнатам Радзівілам і быў знойдзены Пятром Першым у Кёнізбургу. Напісаны гэты летапіс паўуставам у канцы XV стагоддзя, найхутчэй, у Смаленску. Паўустаў – почырк больш хуткі; просты, чым урачысты і павольны ўстаў, але таксама вельмі прыгожы. Радзівілаўскі летапіс упрыгожваюць 617 мініяцюр. 617 малюнкаў у колеры – колеры яркія, жыццярадасныя. Тут мы можам убачыць і войскі, якія ідуць у паход, і бітвы, і аблогі гарадоў. Тут намаляваны князі, паслы са скруткамі прамоваў у руках, умацаванні гарадоў, масты, башты, сцены з “забороломи”, “порубы”, “вежы” і многае іншае. Невыпадкова гэтыя мініяцюры называюць “вокнамі ў свет, які ўжо згінуў”.

На сённяшні дзень многія старажытныя летапісы ўжо надрукаваны і ўвайшлі ў аб’ёмнае выданне, якое мае назву “Полное собрание русских летописей” але гэтае выданне далёка не закончана і цэлы шэраг летапісных спісаў яшчэ чакаюць апублікавання.

Репозиторий ВГУ

## II. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “ЛЕТАПІСАННЕ КІЕЎСКАЙ РУСІ”

1. Які твор называецца летапісам? Дайце навуковае азначэнне паняццю “летапіс”.
2. Чым адрозніваюцца летапісы ад хранографаў.
3. Як вы разумееце паняцці “летапісны звод”, “летапісны спіс”, “летапісная рэдакцыя”.
4. Дайце навуковае азначэнне паняццю “летапісная аповесць”.
5. Які летапіс сёння называюць першым усходнеславянскім агульнадзяржаўным зводам? Хто з’яўляецца яго аўтарам-укладальнікам? У якіх спісах ён дайшоў да нашых дзён.
6. Назавіце першых усходнеславянскіх летапісцаў і іх творы.
7. Ахарактарызуйце тыпы летапісных пагадовых запісаў.
8. Што ў летапісанні мы называем “зыходным момантам”.
9. Як вы разумееце паняцце “летапіснай нарацыі”?
10. Назавіце самае поўнае выданне рускіх і беларуска-літоўскіх летапісаў. Якія летапісы ў ім змешчаны?

## III. ЛЕТАПІСАННЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

### 1. “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”

Галоўнымі творамі, што сыгралі выключную ролю ў станаўленні нашай нацыянальнай прозы, былі “Беларуска-літоўскія летапісы” XV-першай паловы XVI стст. Гэта “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, “Летапіс 1446 г.”, “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”. Яны сталі своеасаблівымі “злучальнікамі” твораў розных жанраў, ад панегірыкаў (“Пахвала Вітаўту”) да легендаў і паданняў, выкладзеных па законах мастацкай прозы Сярэднявечча.

Стваральнік першага беларуска-літоўскага зводу, які складаецца з трох частак (дзве першыя аб’яднаны агульным загалоўка “Избрание лѣтописания изложено вкратце”, трэцяя – уласна “Лѣтописець великых князеи литовъскых”), пачаў сваю працу ў духу старажытнарускага летапісца. “Избрание лѣтописания изложено вкратце” створана на старажытнарускай аснове (кампіляцыя і рэдакцыя з рускіх летапісаў пра пачатак “Земли Рустеи” (854 г.) і наследуе старажытнарускую традыцыю перавагі пагадовых запісаў над сюжэтнымі (летапіснымі) аповесцямі у стылі манументальнага гістарызму. Але ўжо ў ім ярка праяўляецца імкненне пазбавіцца ад пагадовага запісу, што і было зроблена ў “Лѣтописце великых князеи литовскых”.

Названы летапіс пісаўся без датаў, у форме суцэльнага прагматычнага апавядання, фактычна – гэта невялікая гістарычная аповесць, хроніка, якая

Репозиторий ВГУ

складаецца ў найбольш поўных спісах з дзвюх частак: уласна “Летапісца…” і “Аповесці пра Паролле”.

У сваё апавяданне аўтар “Лѣтописца…” ўступіў (па аналогіі з “Евангеллем ад Мацвея”, якое пачынаецца з радаслоўнай Ісуса Хрыста, “Сына Давыдава, Сына Аўраамава”) з пераліку сыноў Гедыміна: “У Великого князя Кгедимина литовского сынов 7 было; старший Монтивид, потом Нарамонт, Олкгирд, потомь Евнутий, потомь Кестутий, потомь Кориат, семый Люборт” [1, 238]. Такога кшталту “генеалагічны” ўступ у апавяданне – нарацыю знамянальны, паколькі першую ступень гістарычнага падання складае генеалогія, захаванне выдатных імёнаў, якія першапачаткова звязаны, як, напрыклад, у Егіпце, з прадметнымі помнікамі, да той пары пакуль на дапамогу не з’яўляецца пісьменнасць, раней за якую немагчыма гістарыяграфія. Пастунова, з далучэннем да генеалагічнай кроны падзей і выдатных подзвігаў, генеалогія пераходзіць у хроніку.

“Лѣтописець великых князеи литовъскых”, апавяданне ў якім вядзецца з дня смерці князя Гедыміна (1341 г.) і заканчваецца пераломам XIV – XV стст., – гэта па сутнасці палітычная гісторыя Літвы, Беларусі і Украіны, заснаваная на імёнах асобаў, якія рэальна існавалі, і падзеях, якія ў сувязі з гэтымі асобамі сапраўды мелі месца або часткова былі выдуманымі, легендарнымі.

Экспазіцыя “Летапісца…” мае яшчэ характар звычайнага сінтэзу “генеалогіі” і “геаграфіі” без якой-небудзь дэталізацыі апавядання, як, напрыклад, у сюжэце пра “завяшчанне” Гедыміна, у якім расказваецца пра падзел вялікім князем сфераў уплыву між сынамі: “…Монтивиду отець дал Карачев и Слоним, Нарамонту Пинеск, Олкгирду королеву отцу, Крево, да к тому князь витебскый сынов не дръжал, принял ко дочце в Витебеск [в зяти]. Евнутя осадил в Вильни на великом княжени, а Кестутю дал Троки, а Корьяту Новгородок, а Люборта принял володимерскый князь [к дочце во Володимер и в Луцеск и] в(о) всю землю Волынскую” [1, 238-239].

Цытата наглядна ілюструе выкарыстанне старажытнарускай стылёвай традыцыі “манументальнага гістарызму”, калі летапісец імкнецца зірнуць на мінулае з “далёкіх адлегласцяў – адлегласцяў прасторавых, часавых (гістарычных) і іерархічных”. Але чым далей – тым летапісец становіцца больш шматслоўным: “генеалогія” і “геаграфія” дапаўняюцца дэталямі, дзеяннямі і якасцямі, і часцей за ўсё гэта адбываецца там, дзе апавяданне вядзецца не пра гераізаванае жыццё, а пра яго кароткія, кульмінацыйныя моманты, як у выпадку з Яўнутам, які “во болшенстве будя не полюбился” братам, а больш за ўсё Альгерду і Кейстуту, і “смовивши межу собою и рок учинили, которого бы дня к Вильни пригнати и засести город под братом, великым княземь Евнутемь…” [1, 239].

Задуманае вялікія князі Альгерд і Кейстут здзейснілі, а “князь великый Евнутий, – паведамляе летапісец, – выскочил, и убежал в горы и в дол и тамо озябе в ноги”. Само апавяданне пра змову з’яўляецца не чым іншым, як завязкай, зыходным момантам у барацьбе за велікакняжацкую ўладу між сынамі Гедыміна. Але знамянальныя тут якраз не змова і людзі, якія ў ёй

Репозиторий ВГУ

удзельнічалі, а слоўны спосаб выражэння фіналу княжання Яўнута, які ў "Хроніцы Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" ідзе не без побытавых падрабязнасцяў і набліжаецца да сюжэтнага белетрыстычнага апавядання: "и в том крику наглом Евнут схопившися, босо,  в кужушку едном, з обламков спустился и утекл сам единь в горы мижи льсы и там собь на грудь змерзлой ноги отморозил, был поиманый от жолньров".

За апавяданнем пра Яўнута і падзеях з ім звязаных ідзе цікавая гісторыя Ваідыла. Бачыцца яна нам першай  у "Летапісцы…" маленькай збелетрызаванай аповесцю з элементамі іерархічнага біяграфізму. "Нехто пак [был] у великого князя Олкгирда [паробок, неволны], холоп, Воидило. Първое был пекарцом, потом уставил его постелю собе слати и воду давати собе пити.  Потом пак полюбился ему вел(ь)ми, дал был ему Лиду дръжати и повел его у великых. Потом по животе великого князя Олгирда две лете бол(ь)ше ль было, князь вяликий Ягайло поведеть его вел(ь)ми у высокых и дасть за него сестру свою родную, княгиню Марью, што потом была за князем Давыдом. Князю [великому] Кестутю великую нелюбовь и жалость вделал, што братанну его, а свою сестру, за холопа дал" (1, 240).

Ваідыл, як бачна, для летапісца не герой, не кандыдат на святы алтар, а "некто", "паробок неволны, холоп". Непрыняцце Ваідыла і ўчынак Ягайлы нарадзілі ў аўтара працытаванага ўрыўка імкненне быць змястоўным у падачы жыццёва-іерархічных фактаў, не надта ганаровых для Ваідыла. Яго жыццё, праўда, не даведзена тут да канца, як гэта бывае ў агіяграфічных ці біяграфічных творах, а выключныя жыццёвыя факты працуюць на адмоўную характарыстыку ўлюбёнца Ягайлы. Такой была задума летапісца як прыхільніка роду Кейстута, які не прымаў "князя-пахоліка" і гэтае непрыняцце, як нам здаецца, вылілася ў афарбаванае эмоцыямі летапіснае сюжэтнае апавяданне. Да таго ж творца "Летапісца…" ў кароткай гісторыі Ваідыла хораша перадаў сутнасць слоў старажытнаяўрэйскага прарока Іязекіля, "што мужы золата здабудуць, а золатам мужоў не здабыць" і гэтым самым выказаў свае негатыўныя адносіны да вядомай з даўніх часоў палітыкі "акняжвання" зямель, у гэтым выпадку зямель Вялікага княства Літоўскага. Ваідыл, па-сутнасці, стаў для летапісца першапрычынай насцярожаных адносін між дзядзькам і пляменнікам, якія пазней перараслі ва ўзброены канфлікт і прывялі да здрадніцкага забойства Кейстута ў Крэўскім замку.

Пасля смерці вялікага князя Кейстута, у палоне, у тым жа Крэве, апынуўся і яго сын, вялікі князь Вітаўт, і, без сумненняў, Ягайла мог распарадзіцца яго жыццём так, як жыццём дзядзькі, але Вітаўтава выратаванне явілася яму ў іпастасях жанчын. "Князь пак великый Витовт седел у Креве у комнате за твердою сторожою, а жонце две ходили покладывать князя у комноту, положив да вон идуть, а сторожи около. То пак великия княгини, слышав от людей, иметь великый  князь Витовт должей седети, аль  пак также изгадають над ним как и над отцемь его. И пригадала ему так: как жонки поидуть покладать, ино ему одное жонки вскладши порты да выйти вон й з другою жонкою, а той жонце остати у нее, у которое портех

Репозиторий ВГУ

вышол. А так его научить. И он наредився в одной жонки порты, да дрогою вышол, да спустился з города: утек в Немци и у Прусы (1, 244).

Летапіснае апавяданне пра ўцёкі Вітаўта з Крэўскага замка з'яўляецца самым арыгінальным, можа быць самым эфектным у "Летапісцы…". Натуральнаму (самі ўцёкі) і незвычайнаму (спосаб уцёкаў) ходу падзей у гэтым сюжэце дала штуршок жанчына, вялікая княгіня, жонка Вітаўта. Самі падзеі апісаны дынамічна і падрабязна, што толькі падкрэслівае праўдападобнасць таго, пра што расказваецца. Перад вачыма паўстае візуальная карціна, сцэнарый, напісаны рукою майстра, схільнага да прыгодніцтва, вольнага ад абсалютнага панавання над ім гісторыі ў фактах і падзеях. Летапісец тут ужо секулярызаваны, ён творыць ад сябе, так як, здаецца, не сядзеў разам з Вітаўтам у камяніцы і не быў сведкам той драматычнай сітуацыі. А мудрая парада вялікай княгіні – гэта маленькае рэха мудрых, але каварных "повелений" княгіні Вольгі, з іменем якой звязаны шэраг вострасюжэтных летапісных апавяданняў у "Аповесці мінулых гадоў". Па маштабнасці спраў Вольгі яе асоба непараўнальная са справамі і асобаю вялікай княгіні, жонкі Вітаўта. Але апошняя выступае ў "Летапісцы…" ужо не як статычная постаць, а як дзейсны ўдзельнік падзей, што знакава не толькі для летапісання, але і для ўсёй беларускай літаратуры часоў сярэднявечча ў сэнсе займення ёю актыўнага героя.

Выдатным узорам нарацыі з'яўляецца ў "Летапісцы…" і апісанне зверстваў смаленскага князя Святаслава над хрысціянскім народам Беларусі ў 1386 г. Страшная, жорсткая летапісная карціна людскіх пакут выяўляла "небогоугодное дело" Святаслава і апраўдвала ваенныя дзеянні літоўскіх князёў. Паражэнне Святаслава пад Мсціслаўлем – гэта, на думку летапісца, справядлівая помста гвалтаўнікам і мучыцелям, якія "много зла сотвориша хрестянемь, не человъчески и ни хрестиянскыи, мучиша хрстянь" (1, 245). "Много зла" – формула асуджэння амаральнасці, праява высокай хрысціянскай маралі. Пафас асуджэння не маралізатарскі, бо спалучаны са страшэннай карціннасцю: "Сбираху и запираху во изьбах и зажигаху, а иныя жены и дъти на коле тыкаху..." (1, 245). Зноў бачым, як жахлівыя малюнкі феадальнай вольніцы пазбаўляюцца маралізатарства, вучыцельнасці. На гэты раз не агульным асуджэннем зла, а спалучэннем "асуджэння" з біблійным сюжэтам: "а иных мук над хрестианы, их же срама ради не писаху, яко же ни Антиох сирскый, ни Улиан преступник такых мукь не сотворил над хрестианы..." (1, 245).

Менавіта тут, у апавяданні пра крывавую бойню, учыненую Святаславам, найбольш ярка выражана пазіцыя самога летапісца, паборніка ідэй цэнтралізатарскай палітыкі беларуска-літоўскіх князёў на Русі і неабходнасці аб'яднання беларуска-літоўскіх земляў у адной дзяржаве – Вялікім княстве Літоўскім. Такім чынам, тэкст "Летапісца..." яшчэ і палітызаваўся па-сярэднявечнаму: карціннасць маралітэ, палітыка-дзяржаўная скіраванасць. А ў цэлым – сінкрэтычнасць, сярэднявечны сінтэз. Аднак сам летапісец, яго самавыяўленне, яго аўтарскае "я" ў першым беларуска-

Репозиторий ВГУ

літоўскім летапісным зводзе яшчэ не бачны. У гэтым сэнсе аўтар яшчэ аморфны. Гісторыя ў імёнах і падзеях валадарыць над ім, а не ён над гісторыяй. Але ўсё ж унутранае, чалавечае паняцце пра дабро і зло, белае і чорнае каларызуе яго аповед, напаўняе яго ўнутранай страсцю, ачалавечвае, а значыць, псіхалагізуе тэкст – у агульнафіласофскім плане.

Такім чынам, "Летапісец вялікіх князёў літоўскіх" – гэта першы і важнейшы этап станаўлення нацыянальнай прозы, на якім пераадолены старыя кніжныя традыцыі, "летапісная форма апісання гісторыі". Ён, на наш погляд, з'яўляецца і ўдалай спробай стварэння звязнага, прагматычнага апавядання пра мінулае.

## 2. Летапіс 1446 года ("І-ы Беларускі летапіс")

Другой прыступкай у станаўленні нацыянальнага летапісання ў яго набліжэнні да нацыянальнай прозы стаў "І-ы Беларускі летапіс" (яго яшчэ называюць "Летапіс 1446 года". Гэты тэкст складаецца з дзвюх частак: першай – "Избрание лhтописания изложено вкратце", другой – "Лhтописець великых князей литовъскых". Храналагічна гэты летапіс ахоплівае час ад "начала Руси" да 1446 года ўключна. Невядомы, але, несумненна, вельмі таленавіты творца "1-га Беларускага летапісу" пакінуў нам арыгінальны гісторыка-літаратурны помнік, адной з жамчужынаў якога стала "Пахвала Вітаўту". Яна, несумненна, асобны, выключны па сіле ўсхваляванасці фрагмент, у якім агіяграфічная традыцыя старажытнарускіх "Казанняў..." пра жыццё святых ("Казанне пра Барыса і Глеба") арганічна спалучылася з прапаведніцкай, дыдактычна-панегірычнай традыцыяй "Слоў" увяльбёнага Серафіёна і "залатавуснага" Кірылы Тураўскага. "Тайну цареву таити добро есть, а дела великаго господоря поведати добро жь есть. Хочю вам поведати о великом князи Александри, зовемем Витовти литовском и русском, иных многих земель господари..." (1, 250).

Так уступае летапісец у пахвалу, у сваю задуму "поведати", гэта значыць, расказаць пра аднаго з самых магутных валадароў Літоўскай дзяржавы – Аляксандра – Вітаўта. Скарыстоўвае маралітэ ("братия, бога боитеся, а князя чтите"), і традыцыю сярэднявечных жыцій (немагчымасць звычайнаму чалавеку, якім сябе лічыў агіёграф, годна ўславіць справы святога). "Но по ней же по писаному есть... Так же и аз хощю вам поведати о славном том господари. Но не мощьно исповедати, ни писанию предати дела великого князя: яко же бы мощно кому испытати высота небесная и глубина морская, тоже бы исповедати мощьно сила и храбрость того славного господоря..." (1, 250-251).

"Хто ж бывае безграхоўным, хіба што адзін Бог?" – пытаўся і сам адказваў на пытанне ўкладальнік "Ізборніка 1076 г.", і памыляўся ў адказе, бо такім жа паўстае ў "Пахвале" князь Вітаўт. Праўда, выпісаны ён статычна, у адпаведнасці з этыкетам сярэднявечнай гістарыяграфіі, не як канкрэтны індывідум, а як канкрэтны сацыяльны тып, прадстаўнік самай высокай

Репозиторий ВГУ

ступені ў іерархічнай лесвіцы грамадства. Аднак манера апавядальніцтва кніжніка пра вялікага князя з'яўляецца новай: яна спалучае ў сабе элементы царкоўна-філасофскага, па-мастацку аформленага апавядання, з якога вычытваецца і канкрэтная гістарычная інфармацыя. Акрамя гэтага, у сваім аповедзе аўтар імкнуўся даказаць чытачам, што Вітаўт адпавядае "божаму прызначэнню" "господаря" не толькі Літвы, але і ўсёй зямлі.

Летапісец, праслаўляючы Вітаўта, наследаваў запавет Кірылы Тураўскага, які той пакінуў у "Слове на сёмы тыдзень па Вялікадні".

"Историци и витиа, - гаварыў прапаведнік, - рекше летописесци и песнотворци, прикланяють своа слухы в бывшая между царей рати и ополчениа, да украсять словесы слышашыая и вьзвеличить крепко храбровавшая и мужествовавшая по своём цари и не давших в брани плещи врагомь, и тех славяще похвалами венчаеть".

Услаўленне, як адну з задач, якія ставіў перад сабою аўтар "Пахвалы Вітаўту", вызначае і В.Чамярыцкі, аўтар артыкула "Летапісы" ў акадэмічным выданні "Гісторыі беларускай дакастрычніцкай літаратуры", які піша, што яна ўяўляе сабой "хутчэй за ўсё ўсхваляванае, эмацыянальнае слова-казанне ў гонар князя Вітаўта", чым звычайны гістарыяграфічны твор, і тут жа дадае, што "ў жанравых адносінах яна набліжаецца да вершаваных панегірыкаў, што пачалі з'яўляцца на Беларусі ў другой палове XVI стагоддзя" (4, 122).

Пахвалу як від панегірычнага жанру ведала і Кіеўская Русь, пра гэта сведчыць "Пахвальнае слова Вользе", "Памяць і пахвала Святому Уладзіміру" (апошняя прыпісваецца манаху Якаву). Пахвала звычайна з'яўлялася і састаўной часткай жыцій святых, іх экспазіцыяй, дзе яна як быццам імітавала галоўныя рысы рыгарыстычнага віду антычнай біяграфіі – енкомій. Калі гаварыць пра "Пахвалу Вітаўту", то яна з'яўляецца не чым іншым, як люстэркам маральнага аўтарытэту Вялікага княства Літоўскага ў асобе Вітаўта і выдатным мастацкім творам, у якім умела скарыстаны сярэднявечны метад абстрактнай ідэалізацыі і які сваёй урачыстай танальнасцю, стылёвымі фігурамі, тропамі (сімволіка, метафары, рытмічная арганізацыя тэксту, эпітэты) ўзыходзіць да пахвал князям у "Аповесці мінулых гадоў" і "Галіцка-Валынскім летапісе". Каб стварыць такі твор, пра гэта сказаў С.Х.Александровіч, патрэбны былі мастацкі талент, багата развітая вобразная мова, пэўная эрудыцыя і доўгі творчы вопыт тагачасных летапісцаў; патрэбен быў трывала ўстаноўлены традыцыйны ўзровень мастацкай і духоўнай культуры ўвогуле.

Імя аўтара, што стварыў "Пахвалу Вітаўту", невядома, бо даўнейшыя кніжнікі часцей за ўсё пакідалі на старонках рукапісаў не аўтографы, як Нестар ("Си на умь азь грьшный Нестерь приимь и оградивься вьрою и упованиемь, яко вься вьзможьна оть тебе суть начать кь слову списания положихь...") – а малітву-просьбу да Бога, як аўтар "Жыція Аўраамія Смаленскага" ("Господи, благослави!... молю ти ся, господи Исусе Христе, сыне божий, молитвами пресвятыя и пречистыа дъвы матере и всъх небесных сил и всъх святых молбами, и дай же ми разум просвъщеи божиею

Рэпазіторый ВДУ

благодатью, подаждь мнѣ, худому и грѣшнѣйшу паче всѣх, свѣтлый подвиг житиа и терпѣния начати о житьи блаженаго Авраамиа…” (7, 67). Нестар, як бачым, асмеліўся ва ўступе да “Жыція увяльбёнага айца нашага Фядосія, ігумена Пячэрскага” назваць сваё імя, а агіёграф, аўтар “Жыція Аўраама Смаленскага”, застаецца безыменным, хаця і адзін і другі ўсімі спосабамі падкрэсліваюць, што яны грэшныя і што толькі Божая воля дапаможа ім у іх працы. Было гэта не столькі імкненнем “застрахавацца” ад нараканняў за дрэнна напісанае “Жыціе”, колькі духоўным пачаткам, “які ўзвышаў думку, закладзеную ў творы, вышэй за асобу аўтара” . Гэта ж самае ёсць у “Пахвале Вітаўту” і ў цэлым “Першым беларускім летапісе”: іх аўтараў можна параўнаць з посудам белага колеру на белым фоне, іх індывідуальнасцяў не бачна, яны невыразныя, але ўнутранае напаўненне посуду – гэта душы і талент летапісцаў, талент апавядальнікаў, гэта іх ярка выражаная пазіцыя прыхільнікаў вялікага князя Вітаўта Кейстутавіча і гарачых патрыётаў Вялікага княства Літоўскага.

### 3. “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”

У 20-ыя гады XVI ст. быў укладзены другі беларуска-літоўскі звод “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, які выкладае гісторыю названай дзяржавы ўжо з антычнасці, з легенды аб перасяленні пяцісот сем’яў рымскіх патрыцыяў на чале з Палямонам у вусце ракі Дубісы, прытока Нёмана. Зварот летапісцаў да антычнасці, да часоў тысячагадовай даўніны з’яўляецца не чым іншым, як іх імкненнем даказаць знатнасць паходжання Літвы і яе валадароў, тое, што ў іх жылах цячэ кроў арыстакратаў. Ні адзін з летапісцаў, па логіцы рэчаў, не мог быць сучаснікам напісанага ў “Выводе и початку о великом князствѣ Литовском и Жмойтском отколь взмоглися и пошли”, адсюль і разняволенасць, выдумка і фантазія пры стварэнні паэтычнай гісторыі паходжання Літвы і радаслоўнай вялікіх князёў. Але менавіта ў паэтычным вымысле, заснаваным на вусных народных паданнях і легендах, перамешаных з фантастычнай гісторыяй старажытнага Рыма і яго імператараў, і заключаецца эстэтычная прыгажосць і мастацкая свежасць летапісных аповесцяў пра пачатак Літвы.

Хто напісаў летапісныя аповесці “О княжати Палемоне и о трех сынох его”, “О великом князи Кгидимине, яко Троки зарубил и Вилну”, “О князи Андреи Полоцком”, “О князи Витовти, як пошол воевати Мир-Туклуя” і інш., нам невядома, аднак несумненна адно: іх стваральнікі былі прафесійнымі летапісцамі, філосафамі і паэтамі. Паэтычная летапісная аповесць (“казачнае апавяданне”, паводле Я.Карскага) пра заснаванне вялікім князем Гедымінам Вільні ў “Хроніцы…” па дынамічнасці дзеяння і жывасці апавядання з’яўляецца ўзорнай для старабеларускай прозы XVI ст. Адметная эстэтыка і багатая творчая фантазія аўтара, прафесійна злучаныя ў аповесці элементы антычнай міфалогіі (“волк железныи”) і фальклору (“ворожбит… именем Лиздѣико, который был наиден в орловѣ гнездѣ”) гавораць пра высокую

Рэпазіторый ВДУ

літаратурную школу летапісца. Завязка апавядання "О великом князи Кгидимине, як Троки зарубил и Вилну" нагадвае традыцыйны ўступ у казку, інтрыгуючы і цікавы, які хутка разгортваецца ў карціну фантастычную ("и спячи ему там (Гедыміну – В.Т.), сон видь, што на горь, которую звали Кривая, топер Лысая, стоит волк желѣзныи велик, а в нем ревет, как бы сто волков было…") з элементамі рэальнага свету (сам князь, прырода і княжацкія ловы). Цэнтральным месцам у аповесці з'яўляецца сон Гедыміна, развязкай – яго тлумачэнне варажбітом Ліздэйкам: "Княже великии. Волк желѣзный знаменуется город столечьныи тут будет, а чьто в нем внутри ревет, то слава его будет слынути на весь сьвет".

Яшчэ Арыстоцель, гаворачы пра фабулу і сюжэт апавядальных твораў антычнай літаратуры, бачыў іх "у сукупнасці падзей і ўчынкаў", антычная ж паэтыка называла вымысел галоўнай якасцю белетрыстыкі. "Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага" манументальна бачыцца нам збелетрызаваным творам, што складаецца з шэрагу асобных летапісных аповедаў з асаблівымі сюжэтам і адмысловымі спосабамі іх выражэння. Так, у легендзе пра заснаванне Вільні пераважае вымысел, сіла аўтарскай фантазіі, скіраваныя на абгрунтаванне гістарычнай тэорыі паходжання Літвы. Дыялог Гедыміна з Ліздэйкам – гэта больш літаратурны прыём, які сведчыць пра рост прафесіяналізму летапісца, яго наватарства, на творчае выкарыстанне спосабаў і прыёмаў нарацыі. Гэта, на першы погляд, малапрыкметны зрух, але калі параўнаць варштат набору прыёмаў і падыходаў да матэрыялу ў "Легендзе…" з прыёмамі старажытных кіеўскіх летапісцаў, то якраз і бачыцца нарастанне ўмельства, "мастацкасці", большы росквіт нарацыі і большыя акцэнты на велічнае, гераічнае, незвычайнае (па драматызму і трагізму). Да манументалізму выявы, такім чынам, даплюсоўваецца выдумка і рэальная канкрэтыка.

### 4. "Хроніка Быхаўца"

Наступным этапам у станаўленні старабеларускай прозы стала "Хроніка Быхаўца", у тэксце якой мы знаходзім даволі многа арыгінальных летапісных апавяданняў, лепшым сярод якіх, несумненна з'яўляецца аповед пра паход князя Альгерда на Маскву. Ананімным да сённяшняга дня застаецца яго аўтар, прафесіянальны летапісец, якому ўжо было цесна ў вузкіх рамках пагадовага летапіснага запісу і які імкнуўся вызваліцца ад сухой, лаканічнай летапіснай інфармацыі. Скарыстаўшы сапраўдны гістарычны факт ( як паведамляюць рускія летапісы, Альгерд двойчы, у 1368 і 1370 гг., сапраўды стаяў каля сцен маскоўскага Крамля), ён стварыў выдатны белетрыстычны абразок, напоўнены высокай патрыятычнай ідэяй. Рэальных дэталяў паходу князя Альгерда летапісец не ведаў, тым не менш апісанне дзеянняў князя ў цэлым адпавядае гістарычным падзеям.

Аднак нас цікавіць не так адпаведнасць праўды летапісца праўдзе гісторыка, колькі яе мастацкае праламленне пад ягоным пяром. Пагадовасць

запісу захоўваецца, але гэтая пагадовасць ужо прыём рарытэтны. Бо паглядзіце, як адразу шырока, з эпічным размахам пачынаецца аповед пра тыя часы, калі маскоўскі князь Дзімітрый Іванавіч "без усякае прычыны" пераступіў дагавор і прыязнасць, "прыслаў да вялікага князя Альгерда пасла свайго з агнём ды шабляй", даючы яму зразумець, што "буду ў зямлі тваёй пасля краснай вясны, пасля ціхага лета" (2, 96). Мы маем тут ёмкасць формулы. Можа, якраз з яе пачынаецца навізна ўзнаўлення часу ў яго эпічнасці, у развітасці абмалёўкі мінулага.

Ёмкасць і эфектнасць зачыну як пачатак рэчышча нарацыі, рэчышча, якое ўвабрала ў сябе маралітэ ("без усякае прычыны, пераступіўшы дагавор і прыязнь") і сімволіку дэталяў (агонь і шаблю шле цераз свайго пасла), – сярэдневяковая, яна не можа існаваць без сімволікі, як і не можа быць незалежнай ад песенна-народнай стыхіі ("Буду ў зямлі тваёй пасля краснай вясны, пасля ціхага лета"). Летапісец ахвотна падхоплівае яе, паведамляючы, што "князь вялікі Альгерд, выняў крэсіва, губку і крэмень, запаліўшы губку, даў паслу, і сказаў так". Тут як бы працяг, "і быў час" – і не без выяўленчай градацыі, нарастанне дзеяння". "І быў ён у міры і добрай прыязнасці". "І быў ён" – хоць ад казачнай формулы "жылі-былі", але адно "і", якое пачынае сказ, - гэта ўжо шырыня жэста ў яго агляднай і зваротнай перспектыве, кругагляднасці, узняцці над гістарычным часам.

"Дай гэта гаспадару і паведамі яму, што ў нас у Літве агонь ёсць, бо ён кажа мне, што хоча быць у маёй зямлі пасля краснай вясны, пасля ціхага лета. А я, дасць Бог, буду ў яго на Вялікдзень, ды пацалую яго чырвоным яйкам цераз шчыт суліцаю, ды з Божаю дапамогаю да горада ягонага Масквы дзіду сваю прысланю…" (2, 97), - так сказаў Альгерд. Спалучыўшы ў маналогу вялікага князя рэлігійна-хрысціянскую сімволіку ("чырвоным яйкам") і сярэднявечную ваенную ("цераз шчыт суліцаю", "дзіду сваю прысланю") летапісец стварыў эпічную карціну незвычайнай ёмістасці. Яна і візуальная, канкрэтная, і алегарычна-сімвалічная ў сваім кантэксце, хаця і немнагаслоўная, бо маналагічная. Апошняе, як нам здаецца, галоўнае, бо ўвядзенне жывога маналога ў структуру летапісу было новым, чыста літаратурным прыёмам.

В.Чамярыцкі назваў аповед пра паход князя Альгерда на Маскву "займальнай гістарычнай навелай", а "Хроніку…" ў цэлым "прыкметным крокам наперад на шляху далейшай белетрызацыі гістарычнага апавядання". З ім можна пагадзіцца, бо "Хроніка Быхаўца" твор сапраўды адметны па індывідуальнай манеры летапісца апавядаць, па дэталізацыі апавядання, па аўтарскай ацэнцы апісаных падзей, па матывацыі ўчынкаў персанажаў. Усе гэтыя моманты ў сярэднявечнай прозе паступова ўзмацняліся па меры руху часу, секулярызаваліся, што, у сваю чаргу, урэшце прывяло да паступовай трансфармацыі летапісных твораў у гістарычныя аповесці, прыватныя мемуары і творы сінкрэтычнага жанру. Апошнія – своеасаблівыя, яны знаходзяцца паміж летапісам і мемуарамі. Першы яшчэ жыве, але ён ужо на

Рэпазіторый ВГУ

парозе знікнення, другія толькі што пачынаюць з'яўляцца на свет, а таму яшчэ жывяцца традыцыямі летапісаў і ў многім падобныя на іх.

## IV. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ "ЛЕТАПІСАННЕ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА"

1. Асноўныя спісы і зводы беларуска-літоўскіх летапісаў. Эвалюцыя летапісання па змесце і форме: ранняе дзяржаўнае XIV – XVI; дзяржаўнае першай паловы XVI ст. Ад пагадавога запісу да летапісных аповесцей.
2. Ідэйны і тэматычны змест "Летапісца вялікіх князёў літоўскіх" і "Летапісу 1446 года". "Пахвала Вітаўту" як узор панегірычнай прозы.
3. Ідэйны і тэматычны змест "Хронікі Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага". Летапісныя аповесці ў "Хроніцы…" (Легенда пра Палямона, аповесць пра заснаванне Вільні князем Гедымінам і інш.).
4. Ідэйны і тэматычны змест "Хронікі Быхаўца". Аповесць пра паход князя Альгерда па Маскву, яе змест, мастацкія асаблівасці. Значэнне летапісных аповесцей ў развіцці сярэдневяковага прыгожага пісьменства ў Беларусі.

## V. БАРКУЛАБАЎСКАЯ ХРОНІКА

Факт "паступовага скону беларускага дзяржаўнага летапісання" і з'яўленне новай, сінкрэтычнай літаратурнай формы "летапіс-мемуары" канстатуе "Баркулабаўская хроніка", вельмі арыгінальны і рэдкі ў славянскім свеце помнік пісьменства. Невядомыя яе аўтары (хоць многія даследчыкі і называюць іх канкрэтныя прозвішчы (Аляксей Мсціславец і Фёдар Магілявец) паставілі перад сабой мэту расказаць пра багатае на падзеі жыццё вёскі Баркулабава і яго ваколіц, пераказаць яго легенды і паданні, падаць дакументы, каб яны не зніклі. У якасці зыходнага матэрыялу тэксту "Хронікі…" яны абралі пагадовыя запісы старажытнарускіх і, несумненна, беларуска-літоўскіх летапісаў XV – XVI стст. Вычытваем мы ў ёй два варыянты іх абазначэння: першы – тыпу "лета божого нароженя 1545…" як бы ўзяты ў рускіх летапісцаў, другі – "…року 1587, месяца октября 1 дня…" – як бы пераходзіць з польскіх хронік, а ўзаемадзеянне гэтых двух планаў тлумачыцца яшчэ жывой агульнаўсходнеславянскай гістарыяграфічнай традыцыяй і польскімі ўплывамі, якія сталі ўжо адчувальнымі ў пачатку XVII ст.

Апавяданне "Баркулабаўскай хронікі" пачынаецца не з апісання дзеянняў і подзвігаў легендарных герояў, не з біблійных часоў, што было ўласціва творам гістарыяграфічнага жанру, а рэальнай айчыннай гісторыяй. Традыцыя старажытнай гістарыяграфіі тут парушана, экспазіцыя "Хронікі…" мае лакальны падзейны характар, які вытлумачваецца цікаўнасцю яе аўтара (аўтараў) найперш да таго, што датычылася канкрэтна сяла Баркулабава або што праз яго праламлялася.

Репозиторий ВГУ

Традыцыйным, як ужо было адзначана вышэй, застаўся пагадовы запіс і сухая, лаканічная намінацыя гістарычных падзей (Берасцейскі сейм 1544 г. з пералічэннем рэальных гістарычных асоб, якія на ім прысутнічалі). Гэты сейм цікавіў аўтара "Хронікі" толькі як факт дзяржаўнага значэння, які павінен быў застацца ў памяці, але які не меў ніякага дачынення да душы. Гэтая ж самая традыцыя вычытваецца і ў аповедзе пра паходжанне Магілёва, узяцце ў 1563 годзе Іванам Грозным Полацка і заснаванне замка "Баркулабов" Баркулабам Іванавічам Корсакам. Аўтар гэтых запісаў, строга прытрымліваючыся летапіснага этыкету, падаў іх у храналагічным парадку, суха, быццам статыст, увёў у аналы гісторыі падзеі, прозвішчы, назвы мясцовасцяў. Ніякага імкнення да дэталізаванага, якаснага, эмацыянальна-вобразнага апавядання тут няма, хіба што ў запісах пра заснаванне Магілёва і ў характарыстыцы Баркулаба Корсака, "ротмистра и старосты дисненского", які "…на лесе глухом, на кгрунте лесном, на врочищу, прозываемом Брус…" [11, 114] заклаў замак, летапісец пастараўся быць больш гаваркім, аднак і тут ён не ставіў перад сабой мастацкай мэты: пісаў гісторыю без выдумкі і фантазіі – факты, падзеі, асобы. У "Баркулабаўскай хроніцы" гэтыя факты, падзеі і асобы самыя розныя. А.Коршунаў, напрыклад, дзяліў іх у свой час на чатыры групы. Да першай аднёс "уласныя назіранні аўтара апошніх запісаў над жыццём сяла Баркулабава і яго ваколіц". Да другой – "запісы, лісты і пераказы іншых асоб". Да трэцяй – "афіцыйныя дзяржаўныя і прыватныя дакументы". І да чацвёртай – "легенды і паданні фальклорнага паходжання" [11, 26].

Як бачна нават з гэтага падзелу, "Баркулабаўская хроніка" – твор шырокага дыяпазону, шматслойны па задуме, можна сказаць, энцыклапедычны. Гісторыя, этнаграфія і фальклор, дакументальная проза, самі дакументы з'яўляюцца складнікамі яе тэксту. Менавіта не толькі асабістасцю летапісца гэты твор наватарскі, але і рознахарактэрнасцю матэрыялу. Можа, ад гэтага ён не такі гарманічны, як аповед пра Альгерда, і ўсеахопленасць у ім не дае адзінага па ўзроўні стылю, пазбаўляе акрэслена вытрыманых жанравых рамак, тым не менш гэта такія недахопы, якія ў цэлым уздымаюць "Баркулабаўскую хроніку" на новы ўзровень.

Парушаючы храналогію і логіку лічбаў, звернемся найперш да чацвёртай групы. Думаем, што А.Ф.Коршунаў не меў рацыі, вылучаючы ў "Баркулабаўскай хроніцы" асобна "легенды і паданні фальклорнага паходжання". Як вядома, легенда – гэта празаічны фальклорны ці літаратурны  жанр, у аснове якога фантастычная з'ява або вобраз, што падаюцца як верагодныя. Рэальныя падзеі ў легендзе цесна пераплятаюцца з фантастычнымі матывамі і ўтвараюць мастацкае адзінства, дзе дамінуе незвычайнае.

У адрозненне ад легенды, паданне – гэта жанр, у якім з элементамі меншай ці большай фактычнай дакладнасці тлумачыліся рэальныя з'явы навакольнага жыцця, расказвалася пра значныя гістарычныя падзеі роднага краю, пра народных герояў. Паданні, як і легенды, блізкія да казак, але

Рэпазіторый ВДУ

вызначаюцца не толькі займальнасцю, у своеасаблівай форме яны неслі людзям веды пра навакольны свет і гісторыю краю. У “Баркулабаўскай хроніцы” няма ні легендаў, ні паданняў у іх чыстым выглядзе. Несумненна, што яе аўтары, якія жылі сярод народа, напэўна ведалі мясцовыя легенды і гістарычныя паданні. Аднак іх у сваю працу яны не ўключылі, найперш пішучы пра тыя падзеі, якія станоўча або адмоўна ўплывалі на рэальнае жыццё сяла Баркулабава. Падзей было даволі: войны і бунты, царкоўныя сіноды і шляхецкія рокашы, неўраджаі і прыродныя катаклізмы, голад, паморкі і многае іншае. Іх канстатацыя якраз і пераважае. Самая ж галоўная падзея, якая адлюстравана на старонках “Хронікі…” – гэта выхад на авансцэну паспалітага, простага чалавека сяла з яго паўсядзённымі клопатамі і праблемамі аб хлебе існым, з яго смуткам, горам, рэдкай радасцю. Мы маем тут відавочны працэс дэмакратызацыі героя ў сярэднявечнай беларускай літаратуры: ад святога ў агіяграфіі, князя – у летапісах, да domusa, чалавека зямлі, сапраўднага  яе гаспадара, жыццё якога было цяжкім, часам невыносным. Голад і холад былі яго бацькамі і братамі, а лыжка сырога варыўца – сястрыцай, якая ратавала яго ад галоднай смерці. Не радасць, а людское гора прымусіла аўтараў “Баркулабаўскай хронікі” адкрыць сваю душу, выказаць сваё “я” ў сувязі з эканамічным становішчам, якое склалася ў Вялікім княстве Літоўскім на пераломе XVI – XVII стст.

Узрушальным, жорсткім, але дакладным па сваёй страшнай праўдзе выглядае апісанне голаду пачатку XVII ст., які прывёў да масавай пагібелі бяднейшых слаёў. Асабліва вясной 1602 года. Храніст стварае апакаліпсічную карціну агульнанароднага гора, беручы за герояў па лініі родавы лік (“маці-бацька”, “сын-дочка”), і хавае па ім (“отец сына, сын отца, матка детки, детки матку, муж жену, жена мужа…”). Ад сваякоў, родных, сямейных ідзе адлік да агульначалавечага гора ў маштабе народа. Бяду-плач зноў жа ўвыпукляе пералічэнне: “…а так мерли одны при местах, на вулицах, на дорогах, во лесах, на пустыни, при роспутиях, по пустых избах, по гумнах померли…” [11, 145].

Пералік – гэта ўвогуле летапісны прыём, па наяўнасці ў летапісах ён даўні, але як спецыяльны тройчы ўжыты ў тэксце, ён па-наватарску просты, уяўляе сабой развіццё традыцыі. Урэшце, не тройчы, бо і чацвёрты раз скарыстоўвае гэты прыём хранікёр і як надзвычай удала, прыгожа выходзіць у простую мову: “А коли тот находив у ворот, албо в дому у кого стояли хлеба просили, отец з сыном, сын со отцем, матка з дочкою, дочка з маткою, брат з братом, сестра з сестрою, муж з жоною тыми словами мовили силне, слезне, горко мовили так: “Матухно, зезюлюхно, утухно, панюшко, сподариня, солнце, месец, звездухно, дай крошку хлеба!” [11, 145].

Але простая мова, просьба хлеба, з’яўляецца не ўласна-асабовай, нібы ад асобы, – яна мностваасабовая (“мовили силне, слезне горко мовили”), у ёй праламляецца нарастанне народнага гора ізноў праз пералік-паўтарэнне, якое становіцца для летапісца  суб’ектыўным і асабістым.

Репозиторий ВГУ

У цэлым “Баркулабаўская хроніка” – твор панарамны, які без агаворкі можна назваць liber vitae  (парадак рэчаў) і які найперш датычыцца subsidium memorias, або запісаў пра важнейшыя падзеі, што адбыліся пры жыцці аўтараў. Найперш было паведамленне пра Берасцейскі сінод 1596 г. Да уніі баркулабаўцы ставіліся негатыўна, падобна казацкім войскам, што рабавалі іх і ўсё Вялікае княства Літоўскае. Негатыўныя адносіны да уніі выказваюцца адкрыта. Як прыклад нагадаем запіс пра службу ў гонар уніі, якую езуіт адправіў у царкве, а Іпаці Пацей у касцёле, то “там же у олтара руского, где служил римлянин, в келиху вино у кров барзо шпетную, смродливую обернулася, же тот езуита не поживал. А у олтара римского у Потея вино обернулося у простую горкую воду…” [11, 130].

Не патрыярхальная забабоннасць, не міфалагічныя ўяўленні кіравалі аўтарам гэтых слоў, а яго стан душы, яго маральны лад жыцця і вера ў свайго Бога, яго разуменне сэнсу уніі. Гэта яго пазіцыя і погляд на рэлігійныя справы, што адбываліся ў канцы XVI ст. на тэрыторыі сённяшняй Беларусі, выказаныя словам, якое ідзе ад фальклору, ад простанароднай вуснай традыцыі.

Асобна баркулабаўцы падаюць у “Хроніцы…” афіцыйныя дзяржаўныя і прыватныя дакументы, узбагачаючы яе фактуру і ставячы шмат якія пытанні. Храналагічна першым дзяржаўным дакументам у ёй ідзе “Лист от послов князя великого московского”, які з’яўляецца папрокам польскаму каралю ў вераломстве ад імя “цара и великого князя Ивана Василевича”. У ім маскоўскія паслы абвінавачваюць стырнавога Рэчы Паспалітай у парушэнні перамір’я 1578 г. і ў захопе Полацка ў 1579 г. Пра апошняе інфармацыя асобная: “Року 1579 господарь король Стефан Батура, кроль полский, княжа седмикгродское, под князем великим московским, князем Иваном Василевичом Полтеск замок взял с поляцми литвою…” [11, 116]. Прыведзены запіс – гэта рэакцыя аўтара “Хронікі…” на ваенныя падзеі, якія адбываліся падчас Лівонскай вайны на тэрыторыі Беларусі. А ў частцы, якая называецца “Москва Могилев выжгла в Петров пост” даюцца паведамленні і пра ўзяцце ў 1580 г. Стэфанам Баторыем Пскова, і пра спальванне Магілёва, пра спусташэнне Шклова і Копыся, пра бітву між маскоўцамі і ліцвінамі пад тым жа Магілёвам, у выніку якой “страшно было трупу московского гледьти; реку Днепр силным трупом язовища загородили, иж колко недель днепровое рыбы не ядали и воды не пивали для великого гнюсу трупу московского” [11, 116].

Лівонская вайна была адной з трагічных падзей у жыцці Беларусі другой паловы XVI ст. Нашы землі сталі месцам крывавых гульняў (дастаткова ўспомніць бітвы і сутычкі пад Полацкам (1563), Оршай (1564), Улай (1564), Азярышчам (1564) і зноў Полацкам (1579). На старонках “Баркулабаўскай хронікі” няма спісаных з аўтапсіі або з пераказу баталістычных карцін, прысвечаных вышэйназваным падзеям. Гэта лагічна, бо яе аўтары не былі баталістамі ці паэтамі героіка-эпічнага складу. Яны былі летапісцамі, найперш скіраванымі на інфармацыю, таму гістарычны,

Рэпазіторый ВДУ

фактаграфічны матэрыял у іх пераважае, і асабліва там, дзе размова ідзе пра справы цэлай дзяржавы. Менавіта гэтай скіраванасцю вытлумачваецца наяўнасць у “Баркулабаўскай хроніцы” і іншых афіцыйных дзяржаўных дакументаў: “Ліста Жыгімонта III ад 11 сакавіка 1592 года”; “Духоўнага прывілея Нікіфара” ад 10 кастрычніка 1596 года; “Листа от пана некоторого з рокошу выписаного о новинах рокошовых”; “Универсала рокошового Року 1606, месеца сентебря 25 дня” і “Ассекурации, то ест вольности”.

Большасць з вышэйназваных дакументаў маюць гістарычную, гістарыяграфічную значнасць, а некаторыя, як, напрыклад, “Ліст Жыгімонта III”, і юрыдычную, бо ліст з’яўляецца не чым іншым, як каралеўскім прывілеем епіскапам-уніятам Кірылу Тарлецкаму, Гедэону Балабану, Лявону Збаражскаму і Гермагену (Рыгору Загароўскаму) на зраўнанне ў правах грэка-каталіцкага духавенства з рымска-каталіцкім, аб вечнай падтрымцы каралеўскай уладай уніяцкай царквы і яе епіскапаў “…яко верных подданых и богомольцов”, - “…паки остатнего живота их ставати будет”.

“Ліст Жыгімонта” змешчаны ў “Баркулабаўскай хроніцы” перад апісаннем Берасцейскага праваслаўнага сінода, які пачаўся 6 кастрычніка 1596 г. (аўтар памылкова падаў 1593), і гэта ў пэўным сэнсе сімвалічна. Па-першае, у ім вельмі ярка выражана пазіцыя польскага караля адносна уніі і яе духоўных бацькоў; па-другое, гэта своеасаблівы, падмацаваны каралеўскім подпісам і кароннай пячаткаю пралог, уступ у справы уніі і падзеі, з ёю звязаныя. І апошняе , “Ліст Жыгімонта”, як і ўсё афіцыйна-дзяржаўнае, што было ўключана ў тэкст “Баркулабаўскай хронікі” ў аўтэнтычным выглядзе, паказвае на імкненне аўтараў чым паўней насыціць яе часавую прастору гістарычнай інфармацыяй самага рознага кшталту. Іншы раз нават не звярталася ўвага на храналагічную паступовасць. Так паступілі і аўтары гарадскіх летапісаў, віцебскага – М.Панцырны і С.Аверка і магілёўцы Т.Сурта і Ю.Трубніцкі. Першыя, акрамя звестак пра мясцовыя падзеі, уключылі ў сваю працу мноства выпісак з твораў знаных у свеце гісторыкаў і летапісцаў (Марціна Бельскага, Яна Длугаша, Пурыуса Пяткевіча, Мацея Стрыйкоўскага). А аўтары “Магілёўскай хронікі” змясцілі у ёй нават літаратурныя творы: вершаваныя пасквілі невядомых пісьменнікаў на польскага прымаса Міхаіла Радзяёўскага і караля Аўгуста Другога, таксама “Замежны карнавал у Польшчы ў 1701 – 1705 гг.”, скіраваны супраць каранаванай асобы і “саксончыкаў” з яго акружэння. Навідавоку працэс алітаратурвання гістарыяграфічных твораў, пашырэнне іх жанравага канону, адыход ад гістарыяграфічнага этыкету ў бок гістарычнай прозы і нават паэзіі. Падобнае ёсць і ў “Баркулабаўскай хроніцы”. Праўда, няма ў ёй “чужых” літаратурных твораў, затое ў многіх месцах яна настолькі літаратурна здатная, што было б вялікім грахом не аддаць належнага яе аўтарам, не назваўшы іх аднымі з лепшых пісьменнікаў – гісторыёграфаў канца XVI- пач. XVII стст., пачынальнікамі гістарычнай прозы ў нашай літаратуры, пачынальнікамі мемуарнай традыцыі.

Рэпазіторый ВДУ

Мемуарныя прыкметы – фактаграфічнасць, рэтраспектыўнасць, непасрэднасць аўтарскіх сведчанняў – у “Баркулабаўскай хроніцы” адшукваюцца няцяжка. І асабліва ў тых частках тэксту, якія А.Коршунаў назваў “уласнымі назіраннямі аўтара апошніх запісаў над жыццём сяла Баркулабава і яго ваколіц”.

Яны яшчэ не абсалютна выразныя, перадмемуарныя, аднак аўтарскі погляд, аўтарская пазіцыя адносна падзей ясна вычытваюцца ўжо ў самым пачатку твора. У запісе за 1579 год, дзе ідзе аповед пра няўдалыя аблогу і штурм літоўскім, мясцовым войскам, на чале якога стаяў баркулабаўскі ўраднік Андрэй Гудоўскі, Смаленска. Тут пазіцыя аўтара, ліцьвіна, паспалітага высокапатрыятычная. Ён на баку сваіх суайчыннікаў, радуецца, што яны “под Смоленском и Рославлем… места выжгли, волости, села попустошили. Под замъком Смоленским моцно и охотне штурм мели…”, шкадуе, што “не дал им господь бог его достати албо выняти; з ласки божое з добычею великою до домов своих здоровы з доброю славою приехали…” [11, 117]. У той жа час у “Баркулабаўскай хроніцы” зусім адсутнічае in nomine Domini omen (жыццё пісьменніка). Для літаратуры канца XVI – пач. XVII стст. самым важным была падзея, “падзея палітычная, ваенная, сямейная, метэаралагічная” (А.Мальдзіс). Аўтарская асоба, яе прыватнае жыццё выяўляліся рэдка, і гэта было звязана з пераходным перыядам у літаратурнай творчасці: ад летапісу да мемуараў, ад фіксацыі падзей да іх белетрыстычнага адлюстравання, у якім ужо прыватнае жыццё мемуарыста як бы канструявала грамадскае і якое абавязкова падавалася праз прызму аўтарскай філасофіі і маралі. Такія творы з’явіліся ў нас пазней, і найлепшыя з іх – мемуары С.Маскевіча, Я.У.Пачобута-Адляніцкага, К.Завішы, М.Матушэвіча. У палякаў непараўнальным узорам такога твора з’яўляюцца “Мемуары” Я.Х.Пасека [10]. А пакуль вернай прыкметай перадмемуарнага пачатку ў “Баркулабаўскай хроніцы” служаць аўтарскія пачуцці, эмоцыі, перажыванні, праяўленне ўнутранага аўтарскага “я”, якое было характэрным для новага, рэнесансавага светабачання чалавека канца XVI – пач. XVII стст.

## VI. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ “БАРКУЛАБАЎСКАЯ ХРОНІКА”.

1. Назавіце магчымых аўтараў “Баркулабаўскай хронікі”.
2. Ахарактарызуйце кампазіцыю летапісу.
3. Якія дзяржаўныя дакументы ўваходзяць у склад “Баркулабаўскай хронікі”.
4. Вызначце мемуарныя элементы ў тэксце летапісу.
5. Патлумачце паняцце domus у дачыненні да “Баркулабаўскай хронікі”.
6. Якія легенды і паданні ўваходзяць у склад “Баркулабаўскай хронікі”.
7. Як вы разумееце паняцце “секулярызацыя героя” у “Баркулабаўскай хронікі”.

Рэпазіторый ВДУ

# VII. ВІЦЕБСКІ ЛЕТАПІС МІХАЛА ПАНЦЫРНАГА І СЦЯПАНА АВЕРКІ

Беларуска-літоўскія летапісы сталі вяршыняю ў нашай даўняй гістарычнай прозе. Яны – мост, перакінуты ад старажытнай летапіснай формы апавядання да новых жанраў і відаў пісьменства, і сярод іх найбольшую гістарычна-пазнавальную і літаратурную каштоўнасць маюць мемуары і гарадскія летапісы (хронікі). З апошніх сёння вядомы напісаныя на польскай мове "Магілёўская хроніка" Трафіма і Юрыя Трубніцкага, а таксама "Віцебскі летапіс" Міхаіла Панцырнага і Стафана Аверкі [1, 257-280].

"Магілёўская хроніка" пераўзыходзіць "Віцебскі летапіс" і фактураю, і літаратурнасцю, і гістарычнай дакладнасцю. Але тым не менш усё, што існуе, мае права на існаванне, і "Гісторыя горада Віцебска" тут не выключэнне. Запісвацца яна пачала ў сярэдзіне XVIII ст. і была аформлена як летапіс у 1768 годзе. У стварэнні летапісу прынялі ўдзел не двое, як гэта пазначана ў тытуле, а чацвёра віцебскіх гараджан: Міхал Панцырны, Ян Чарноўскі, Гаўрыла і Стафан Аверкі. Найбольш, безумоўна, зрабіў Міхаіл Панцырны. Ён заклаў аснову летапісу і давёў яго запісы да 1709 года. А "збудаваў" летапіс Стафан Аверка. Ён аб'яднаў у адно цэлае і кніжку М.Панцырнага, і кароткія запісы свайго бацькі Гаўрылы Аверкі (1704 – 1757), і запісы Яна Чарноўскага (1601 – 1733). Акрамя таго, ён дапісаў і заканчэнне летапісу і ўключыў у яго падзеі, якія выпісаў з "розных прачытаных кніжак", найперш з польскіх хронік Мацея Мехавіты (1457 – 1523), Марціна Кромера (каля 1512 – 1589), Марціна Бельскага (каля 1495 – 1575), Яна Длугаша (1415 – 1480) і іншых. Уся гэтая праца, як сведчыць сам Стафан Аверка, была закончана ім у 1768 годзе, і толькі пасля яе летапіс набыў той выгляд і тую форму, якія мы маем цяпер.

Калі ацэньваць "Віцебскі летапіс" наогул ці параўноваць яго з "Магілёўскай хронікай", дык ён сапраўды ў многім кампілятыўны, па форме нястройны і нават у нечым нелагічны. Няма ў ім разгорнутых сюжэтных апавяданняў, матэрыял яго сухі, неапрацаваны і нелітаратурны. Але ў ім ёсць тое, чаго не мае ні "Магілёўская хроніка", ні іншыя пісьмовыя крыніцы XVII – XVIII ст.ст. Несумненна каштоўнымі ў летапісе з'яўляюцца арыгінальныя звесткі з гісторыі Беларусі і Віцебска і асабліва сведчанні пра мілітарныя і палітычныя падзеі канца XVII – пач. XVIII ст.ст. Для прыкладу: паведамленні пра казакаў Шухалея і Дубіну, пра бітвы віцяблян з маскоўцамі ў Кашэвічах і Глаздовічах; пра сквапнага каралеўскага камісара Рыбінскага і ліхога капітана Салаўёва (у тэксце *Салаваў.* – В.Т.), які ў 1708 годзе выпаліў Віцебск, як крыху раней Магілёў, Быхаў, Дуброўна, Оршу.

А ўвогуле фактура "Віцебскага летапісу", які займае ўсяго тры дзесяткі друкаваных старонак, не бедная. Знаходзім мы ў ім паведамленні самыя разнастайныя: і пра каметы, і пра пажары, і пра Хрыстафора Калумба, і пра частыя паморкі, якія лютавалі ў Віцебску і ваколіцах. Аднак гістарычную каштоўнасць летапісу змяншаюць недакладнасці. Так, напрыклад, гаворыцца

Репозиторий ВГУ

пра заснаванне Віцебска кіеўскай княгіняй Вольгай у 974 годзе. Але, як вядома, Вольга памерла ў 969 годзе, і таму заснавальніцай горада яна быць не магла. Некаторыя вучоныя бачаць тут памылку перапісчыка, які памяняў лічбы 7 і 4, лічаць, што гару на Дзвіне Вольга "ўпадабала" ў 947 годзе.

Памылкова таксама пададзены ў летапісе звесткі пра жаніцьбу князя Альгерда, дата спальвання мітрапаліта Герасіма (1415 замест 1435), год бітвы казакаў са шведамі пад Галоўчынам, якая адбылася не ў 1701 г., а ў 1708-м, і іншае. Пра гэта ў свой час пісаў М.М.Улашчык, ён жа і выдаў "Віцебскі летапіс" у 32-м томе "Полного собрания русских летописей" (М., 1975).

## VIII. ЛЕТАПІС ПАНЦЫРНАГА І АВЕРКІ (ДАДАТАК)

Гісторыя горада Віцебска, што дзеяліся на свеце ў даўнейшыя часы. Выпісаны тут слова ў слова з кніжкі, пісанай рукою ягамосці пана Міхала Панцырнага, мешчаніна віцебскага, Стафанам Гаўрылавічам Аверкам, мешчанінам віцебскім у годзе 1768, месяца ліпеня, 13 дня.

ПАЧЫНАЕЦЦА НАПІСАНАЕ Ў КНІЖЦЫ ПАНЦЫРНАГА ТАК:

У год 974. Вольга, пабіўшы яцвягаў і печанегаў, пераправілася з воямі праз раку Дзвіну і заначавала, а ўпадабаўшы гару, заклала драўляны замак, які назвала ад ракі Віцьбы Віцебскам. У Верхнім замку змуравала царкву святога Міхала, а ў Ніжнім – Звеставання. Два гады тут пражыўшы, ад'ехала да Кіева.

У год 965. У Гнезне прыняў хрышчэнне польскі князь, названы ў хрышчэнні Мечыславам, і Польшча веру прыняла.

У год 980. Венгерскі князь Гейса, сын Токаў, бацька святога Стафана, прыняў хрышчэнне, а з ім і ўся Венгерская зямля.

У год 956. У Канстанцінопалі прыняла хрышчэнне Вольга: у святым хрышчэнні названа Аленай.

У год 990. У Корсуні з вады прыняў хрышчэнне Уладзімір, а на другі год і Кіеў ахрышчана. Гэта Уладзімір заклаў Полацкае архіепіскапства. Быў унукам княгіні Вольгі, названай у святым хрышчэнні Аленай. З блаславення папы Андрыяна, Мяфодзій і Кірыла патлумачылі грэцкія кнігі на мову славенскую, і першая Божая служба ў мове славенскай была адпраўлена ў Рыме года Божага 895.

З РУСКІХ ХРОНІК

У год 896. Ад стварэння свету, па-рускаму лічыцца ў год 6400, грэцкія кнігі патлумачылі на мову славенскую.

У год 1114. Уладзімір унук Вольгі, віцебскай княгіні, памёр у Кіеве.

У год 1162. Волхаў, вялікая рака, што была ў Расійскай дзяржаве, праз пяць дзён ішла ўверх.

Репозиторий ВГУ

У год 1695 Галіцын хадзіў на Крым.

У год 1697. Хадзіў Галіцын на Крым у другі раз. Там далі яму татары водкуп: замест залатых дукатаў, некалькі бочак медзякоў.

ПЕРАПІСАНА З ІНШЫХ ХРОНІК

У год 1171. У Полацку князёўна Еўфрасіння змуравала царкву Святога Спаса і была тут манашкай. Яе цела перавезена ў Кіеў.

У год 1179. Баляслаў, польскі кароль, забіў у касцёле святога Станіслава, кракаўскага біскупа.

У год 1199. Ерусалім здабыты і забраны ад князя Готфрыда, католіка, які, забраўшы яго ад турка, быў у ім каралём. А перад гэтым гадоў праз 10 трымалі горад Ерусалім сарацыны.

У год 1189. Ізноў туркі зноў забралі ад католікаў Ерусалім.

У год 1213. Пры Фрэдэрыку Барбаросе, імператары рымскім, закон святога Даменіка і святога Францішка заснаваны, а папай Ганорыем пацверджаны.

У год 1211. Была на небе вялікая камета. Трывала дзён васемнаццаць, мела хвост, скіраваны на захад сонца. Знакавала першае прышэсце татараў да Польшчы і Русі, якіх перад гэтаю каметаю не бывала.

У год 1323. Гедымін князь пачаў будавацца, заклаў горад Вільню, а гэта было такім чынам. Гэты Гедымін, будучы ў ловах на тым месцы, дзе стаіць Вільня, забіў вялікай постаці страшнага зубра і пасля сваіх ловаў заначаваў у пушчы на Лысай гары. А праз сон убачыў, што быццам бы вельмі вялікі воўк, стаўшы на самай гары, пачаў выць, а ў ім убачыў і сто другіх ваўкоў, якія таксама вылі. Маючы ад гэтага вялікае здзіўленне, прачнуўшыся, загадаў ён паклікаць для тлумачэння сну вешчуна, імя якому было Лездэйка, якому, калі стаў перад Гедымінам-князем, князь сон распавядаў і загадаў вытлумачыць. Ён такім чынам пачаў тлумачыць, што на тым месцы, дзе сон бачыў, дзе бачыў вялікага ваўка, маецца стаць вялікі горад, а выццё ваўкоў значыць тых мяшчан, што будуць жыць у горадзе, і гэты горад слаўным будзе, стане першай сталіцай Літвы, а слава яго і голас пашырацца па ўсім свеце. Быў з гэтага князь вельмі задаволёны, вешчуна багата ўзнагародзіў і надаў яму ганаровыя званні а што парадзіў Вільню заснаваць, назваў яго Радзівілам.

У год 1307. Папскі пасад перанесены з Рыма ў французскі горад Авіньён папам Кліментам Пятым.

У год 1376. Папскі прастол з французскага горада Авіньёна перанесены назад у Рым папам Грыгорам Адзінаццатым.

У год 1387. Літоўскі князь Ягайла пахрышчаны, узяў за сябе польскую каралеву і злучыў Літву з Польшчай.

У год 1432. Месяца верасня забраў турак ад грэцкага імператара Канстанцінопаль.

У год 1489. Ісідар, мітрапаліт кіеўскі, ездзіў на сабор у Фларэнцыю, там яго святы айцец ушанаваў тытулам кардынала, толькі, калі вярнуўся з

Репозиторий ВГУ

Фларэнцыі ў Кіеў, не ўзлюбіў гэтага маскоўскі князь і загадаў пасадзіць яго ў Смаленск у вязніцу, ад чаго ратуючыся, уцёк у Польшчу.

У год 1453. У Вільні памёр святы Казімер, польскі каралевіч, сын польскага караля Казімера Вялікага.

У год 1453. Памёр бернардзін Сымон Дзеліпніка.

У год 1332. Літоўскі князь Альгерд узяў сабе ў жонкі дачку цверскага князя Марыну, або Улляну. Дадзена яму ад цвярскога князя ў пасаг Віцебск: нажыў з ёю дванаццаць сыноў. Гэтая Улляна змуравала ў год 1345 царкву Святога Духа.

Цэвіўку, віцебскага старасту, і Герасіма - ўладыку спалена за здраду на Жыдоўскім каменні ў год 1415.

Загадаў Альгерд павесіць пяць вялебных манахаў, якія зараз усе ў праваслаўных святцах.

У год 1495. Эмануіл, партугальскі кароль, паслаў морам на ўсход сонца, да Індыі, двух дасведчаных у зорнай навуцы, Крыштафа Калумба ( так у тэксце – В.Т.). Першы раз праз гэта, з іх розуму, знайшлася дарога ў падземныя краіны.

У год 1510. Цар Іван Васільевіч мураваў Смаленск гадоў сем. Гэты цар Іван Васіллевіч заваяваў і выбіў Ноўгарад.

У год 1523. Марцін Лютэр, уцёкшы да саксонскага князя і курфюстра Яна, узняў новую веру.

У год 1543. Венгры паддаліся туркам і аддалі замкі Будзін, Пешт, Белгарад Валп, Вышгарад і іншыя.

У год 1562. Быў у нашым краі Шухалей, казак, валюнтарыст. Гэты многа ліхога нарабіў у Польшчы і Белай Русі.

У год 1563. Цар ягамосць Іван Васільевіч узяў Полацк.

У год 1577. Стэфан Баторы, сямігродскі князь і ваявода, абраны на Польскае каралеўства.

У год 1601. Быў з-за марозаў вялікі голад.

У год 1602. Казакі з атаманам Дубінам за здраду віцебскіх мяшчан Віцебск выбілі.

У год 1603. У Віцебску і па іншых гарадах лютаваў паморак.

У год 1604. Акаваных Дубіну, атамана, і дванаццаць старшых прывялі ад караля, а потым на Заручаўскіх Валатоўках трох з іх пасадзілі на палю жыўцом.

У год 1605. Віцебскі мешчанін Марка Іллініч Лытка, маючы з сабою пяцьсот чалавек мяшчан, хадзіў здабываць феліч. Іх завёўшы, Фелін ( так у тэксце – В.Т.) здабыў.

У год 1606. Віцебскаму мешчаніну Марку Літку дадзены прывілей на шляхецтва і права называцца Фялінскім. А на Бенцы, Сокальскім прадмесці, даў яму кароль ягамосці пяцьсот грыўнаў падаравання штогодна і на пяцьдзесят гадоў.

У год 1606. Быў рокаш і вялікая сумятня.

Репозиторий ВГУ

У год 1606. Цар ягамосць Дзмітры узяў за сябе панну Мнішкаву з Сандаміра, і калі нашы палякі прыбылі з ёю ў Маскву, тады ў гэтую ноч цар ягамосць Дзмітры быў забіты, а нашых палякаў з Мнішкавай ганебна выгналі.

У год 1609. Кароль Жыгімонт Трэці падступіў да Смаленска.

У год 1610. Кароль Жыгімонт , мінамі і порахам падарваўшы Смаленск, яго ўзяў і здабыў.

У год 1611. Палякі заваявалі Маскоўскую сталіцу.

У год 1614. Скапін ( Скапін-Шуйскі – В.Т.), прыйшоўшы да Маскоўскай сталіцы, выгнаў з яе палякаў.

У год 1614. Калі ўязджаў ваявода Ракаўскі, тады ў Віцебску згарэлі абодва замкі.

У год 1614. У Глазовічах мелі віцябляне сутычку з маскоўцамі, маскоўцы віцяблян пабілі.

У год 1619. Кароль Жыгімонт заключыў з маскоўскім царом мірны дагавор.

У год 1620. Кароль Жыгімонт пачаў ваяваць з туркамі, а на другі год заключыў саюз.

У год 1620. Блаславёны Язафат, забраўшы ў Полацку царкву Святой Сафіі, загадаў яе паправіць і аздобіць нанова.

У год 1623. Месяца лістапада, другога дня, паводле старога календара, на другі дзень рускага свята Кузьмы і Дзям'яна, у Віцебску мяшчане віцябляне замардавалі і забілі блаславёнага Язафата.

У год 1629. Напярэдадні свята Ахвяравання Найсвяцейшай Панны, свята рускага, згарэла Саборная царква, у якой згінула незлічонная колькасць сабранага скарбу: золата, серабра, жэмчугу і другіх каштоўнасцей.

У год 1632. У Варшаве памёр ягамосць польскі кароль Жыгімонт Трэці.

У год 1633. Месяца ліпеня , дзевятага дня, маскоўцы напалі на горад Полацк і ўвесь выпалілі.

У год 1635. Кароль Уладзіслаў адагнаў ад Смаленска Шэіна і Прозара (Празароўскага – В.Т.).

У год 1635. У Кашэвічах віцябляне на чале з Клачкоўскім разграмілі чатыры тысячы маскоўцаў, за гэта вернуты ім усе вольнасці і магдэбургія, бо за забойства блаславёнага Язафата гэта ўсё, вольнасці і магдэбургія, было ад іх забрана.

У год 1636. Па памерлым мітрапаліце Восіпе Рудніцкім стаў мітрапалітам усёй Русі Сялява, які, прыехаўшы на віцебскае епіскапства, паздымаў з віцебскіх цэркваў званы і загадаў адліць з іх звон для Саборнай царквы, а Саборную царкву, паводле дэкрэтаў камісараў, збудаваў горад.

У год 1643. Горад Полацк выгараў увесь дашчэнту і да аднаго дома.

У год 1648. У Мерачы, у месяцы маі, памёр ягамосць польскі кароль Уладзіслаў Чацвёрты.

Рэпазіторый ВДУ

У год 1654. Цар Аляксей Міхайлавіч пачаў ваяваць з польскім каралём Янам Казімерам і ўсе гарады ў Літве і Белай Русі напоўніў сваім войскам, салдатамі.

У год 1657. Цар Аляксей Міхайлавіч пайшоў пад Рыгу.

У год 1661. Паправілі і аздобілі царкву Святога Духа.

У год 1665 . Пад Віцебскам, на другі дзень рускіх запустаў, разбіў гетман войска Івана Хаванскага.

У год 1667. Стаў з маскоўцамі мір і на рускае свята Еўдакіі былі аддадзены Полацк, Віцебск, Дзісну, Дынабурк, Оршу і Мсціслаў.

У год 1668. Польскі кароль Ян Казімер пакінуў Польскае каралеўства, па ім, у год 1669, абраны Міхал Карыбут Вішнявецкі.

У год 1669. Мая 13 дня кароль Міхаіл Вішнявецкі каранаваны на Польскае каралеўства.

У год 1669. У Віцебскай Кафедральнай царкве створана брацтва пад назваю Успення Найсвяцейшай Панны.

У год 1674. Месяца сакавіка, дваццатага дня кароль ягамосць Ян Сабескі каранаваны на Польскае каралеўства.

У год 1680. Месяца верасня , 16 дня выгараў Віцебск, сам горад, чатыры царквы, ратуша і крамы.

У год 1677. Цар Аляксей Міхайлавіч аддаў нашым паслам , князю Чартарыйскаму і гетману Сапегу, Веліж, Невель і Себеж; на польскае свята святога Міхаіла з гэтых замкаў адступілі.

У год 1682. Месяца студзеня , II дня ўступленне ксяндзоў базыліянаў у кафедральны віцебскі кляштар.

У год 1684. Ягамосць віцебскі падкаморнік Адам Кісель за свой кошт пераплавіў сялявінскі звон, які быў адліты з трох брацкіх званоў.

У год 1686. Была ў Віцебску ў Дзвіне вельмі вялікая вада, многа шкоды нарабіла віцяблянам, дамоў сто заліла і знясла прэч.

У год 1685. Месяца лістапада, 12 дня Леанард Пацей уехаў на Віцебскае ваяводства.

У год 1689. Збудавана царква Святой Тройцы Маркаўскай.

У год 1690. Месяца снежня. Так у цэксце – В.Т. 24 дня памёр бурмістр Давід Фелінскі-Лытка.

У год 1693. На свята Сымона Юды ў Супраслі памёр ксёнз Цыпрыян Жахоўскі, мітрапаліт, віцебскі біскуп.

У год 1694. Калачынскі, старшы віцебскі саборны, уцёк у Кіеў.

У год 1694. Месяца жніўня, 3 дня наўкола Віцебска быў вялікі град, пабіў у полі ўсё збожжа.

У год 1695. Цар ягамосць Пётр Аляксеевіч хадзіў з войскам пад Азоў. Многа людзей страціўшы, назад вяртаўся праз Віцебск.

У год 1695. Памёр ваявода Леанард Пацей.

У год 1695. Былі моцныя маразы, аў годзе 1696 вялікая дарагавізна на збожжа, бочка жыта каштавала ў Віцебску па два талеры бітыя.

У год 1695. Андрэй Крышпін уехаў на віцебскае ваяводства.

Репозиторий ВГУ

У год 1695. Месяца мая, 26 дня па старому, аыпаў па калена снег і ляжаў тры дні.

У год 1696. Як пакачаўся новы год, не было саннай дарогі. Дзвіна не замярзала цэлы год, не было ніякіх тавараў, бо ў мінулым, 1695. годзе мароз пабіў усё збожжа.

У год 1696. На свята Благавешчання прыехаў у Віцебск мітрапаліт Даленскі.

У год 1696. Месяца чэрвеня , 17 дня памёр ягамосць польскі кароль Ян Трэці.

У год 1696. Цар ягамосць Пётр Аляксеевіч, пайшоўшы пад Азоў, насыпаў на паўтары мілі вал і месяца ліпеня, 17 дня па старым, узяў Азоў, а весь люд у горадзе загадаў пасекчы.

У год 1697. Месяца ліпеня, дня пятнаццатага спаліў пярун ноччу Вялікі замак.

У год 1697. Месяца жніўня, 20 дня была ў Смаленску вялікая бура.

На вале сарвала з кранштэйнаў дах, з царквы купал з крыжамі і званіца са званамі паабрывала.

У год 1697. Кароль ягамосць Аўгуст Другі каранаваны ў Кракаве месяца верасня пятнаццатага дня; месяца…. першага дня быў у Віцебску трыумф.

У год 1968. Месяца жніўня 15 дня ў Віцебску, у царкве Благавешчання згарэлі дах і званіца, і 35 дамоў у Ніжнім замку.

У год 1698. Была ў Віцебску вялікая бура, з дамоў пазносіла дахі, з Заручаўскай царквы сарвала купал.

У год 1698. Андрэй Крышпін уехаў на віцебскае ваяводства месяца сакавіка 20 дня; назаўтра быў у ратушы.

У год 1697. Цар ягамосць Пётр Аляксеевіч ездзіў па розных нацыях, вярнууся ў Смаленск месяца жніўня 19 дня.

У год 1699. На Благавешчанне памёр мітрапаліт Сымон Даленскі.

У год 1699. Заняў на мітраполію Сільвестр Лада Пашкевіч.

У год 1699. Цар ягамосць Пётр Аляксеевіч у сваіх гарадах і мястэчках пасадзіў бурмістраў і загадаў, каб усе ўбіраліся па-нямецку і год ад Нараджэння Божага, а не ад стварэння свету ў сваіх справах пісалі і ставілі.

У год 1699. Кароль ягамосць Аўгуст Другі адабраў ад турка Камянец-Падольскі.

У год 1700. Горад Віцебск і мяшчане разбіраліся з віцебскімі жыдамі. Ваявода яго вяльможнасць пан Крышпін хацеў быў двух жыдоў, Іцка і Меера, павесіць, а ўсіх жыдоў, аж да апошняга, у горадзе Віцебску і на прадмесцях загадаў мяшчанам пасекчы, але мяшчане на такое не адважыліся, бо былі жыды віннымі ваявадзянам вялікія сумы.

У год 1700. Месяца ліпеня 15 дня горад Дзісна выгараў да шчэнту, аж да апошняга дома.

У год 1700. Месяца р-бра. (так у тэксце – В.Т.) віцебская шляхта выйшла на паспалітае рушэнне да Чарэі.

Репозиторий ВГУ

У год 1700. Месяца ліпеня кароль ягамосць Аўгуст Другі разбіў у полі шведа і ўзяў Куканаўс.

У год 1700. Ішоў праз Віцебск Дзвіною-ракою дваццацю стругамі з войскам у 17 000 люду палкоўнік, а на Оршу ішоў з войскам другі палкоўнік; віцябляне, паклаўшы стосаў з дзесяць хлеба, цэхамі сустракалі іх у полі і гэты хлеб аддалі.

У год 1700. Каля Ашмянаў сын гетмана Сапегі разграміў у полі войскі Рэчы Паспалітай.

У год 1700. Восенню была ў Дзвіне вада ў два разы большай, чым па вясне, многа школы мяшчанскім дамам нарабіла і пашкодзіла.

У год 1700. У Вільні гетман Сапега пастраляў княжат Вішнявецкіх.

У год 1700. Месяца лістапада 18 дня ў Алкініках гетманскае Сапежынскае войска разбіта Рэччу Паспалітай. Там жа пасля бітвы схопленага сапежынскага сына, канюшага Войну і іншых пасеклі.

У год 1700. Казакі пад Рыгай разбілі шведа.

У год 1700. Рэпнін з 8 тысячамі ад цара ягамосці прыйшоў ад Пскова пад Рыгу на дапамогу каралю ягамосцю.

У год 1700. Пад Дэрптам са здрады немца Адама Адамовіча разбілі шведы войска цара ягамосці.

У год 1701. месяца лютага 17 дня каралеўскі палкоўнік і з ім 2000 рэйтараў прыбылі ў Віцебск на сустрэчу цара ягамосці.

У год 1701.Месяца лютага 19 дня цар ягамосць Пётр Аляксеевіч не вельмі вялікай світай, але стройна, уехаў у Віцебск і стаў у бурмістра Зататая. Амаль усім людзям даўся бачыцца. На трэці дзень ад’ехаў з Віцебска да Біржаў.

У год 1701. Камісар караля ягамосці, дваранін Жыгімонта прыехаў у Віцебск на выбіранне даўгоў, якія віцебскія мяшчане былі вінаватымі Рызе.

У год 1701. У маі гэты ж камісар Рыбінскі прыехаў у Віцебск другі раз, а з ім і 1000 саксонскіх райтэраў. Стаяў па мяшчанах у Віцебску дзён 14; вялікая была ад іх гораду шкода, жывадзерства, здзерства і свавольства. Многа даўгоў выбраў па віцебскіх купцах, што былі вінаватыя Рызе, гатовымі грашыма шэсцьдзесят чатыры тысячы талераў бітых. 40 стругаў наладаваў адною пянькою, 15 канаплямі і стругамі па Дзвіне-рацэ ад’ехаў. Многа ўзяў у віцебскіх купцоў рыжскіх даўгоў гатовымі грашыма, пянькою і каноплямі; тое і другое рахуючы, талераў больш чым на сто тысяч. За гэта ўсяму Віцебскаму надаў кароль прывілеі, вызваліў яго ад усіх падаткаў, малых і вялікіх. Даў свабоду гадоў на сем, каб нічога не плаціў у скарб яго каралеўскай міласці.

У год 1701. Месяца мая камянецкі палкоўнік праводзіў на пяці стругах 444 бочкі пораху і каля тысячы чалавек царскай пяхоты.

У год 1701. Месяца ліпеня 8 дня войска Рэчы Паспалітай з іх вяльможнасцямі панамі Пацеямі пабіла пад Дуброўнам 18 тысяч семсот сялян, якія былі сабраліся супраць іх.

Репозиторий ВГУ

У год 1701. Месяца красавіка , на рускі Вялікадзень, пад час начнога набажэнства былі страшныя грымоты, у час якіх запаліла царкву святога Яна Багаслова, але людзі, што былі на начным набажэнстве, затушылі.

У год 1701. Месяца ліпеня 24 дня саксонцы ўзарвалі порахам Куканаўс і паразрывалі гарматы. Гранатамі сапсавалі мост, а самі, пераправіўшыся з маскоўскім войскам праз Дзвіну, пайшлі ў Курляндыю, а самі, пераправіўшыся з маскоўскімі войскамі праз Дзвіну, пайшлі ў Курляндыю, а маскоўскае войска ў Друю, а потым пайшлі ў Пскоў. Назаўтра прыбылі шведы і забілі віцебскага купца Ксаверы Александровіча, а яго маёмасць паразбіралі ў лодкі.

У год 1701. Казакі з нашым Юрэвічам у Галаўчыне, пад Магілёвам, пабілі шведаў.

У год 1701. Месяца снежня забралі шведы назад ад Масквы Дыямент (Дынабург – В.Т.).

У год 1702. Швед увайшоў у Жамойдзь, а потым у Літву і Белую Русь, і ўсюды браў правіянт.

У год 1702. Месяца красавіка 5 дня шведскі кароль з 20 тысячамі войска ўвайшоў у Вільню.

У год 1702. На самы Вялікдзень нашы, уварваўшыся ў Вільню, пабілі 1000 шведаў, старшых загінула чалавек 250, за што шведскі кароль помсціўся манахам і мяшчанам: пасадзіў іх у цёплую баню, загадаў нанасіць і накласці ў яе трупаў і папарыць іх з трупамі ў гарачыні і смуродзе.

У год 1702. У Кракаве шведскі кароль спаліў палац. Торунь зруйнаваў і ўсю Польскую дзяржаву рабаваў без усякай міласэрнасці.

У год 1703. Палкоўнік Пратопаў (так у тэксце, напэўна Пратапопаў – В.Т.) і з ім 20000 чалавек ішлі праз Віцебск, а другі з 70000 чалавек ішоў праз Оршу.

У год 1703. Ішло праз Віцебск 1500 вазоў з кулямі і порахам.

У год 1703. Касцёл дамініканаў святога Міхала (так у тэксце – В.Т.).

У год 1703. Месяца р-бра ( так у тэксце – В.Т. праводзілі ўніз 8000 гармат, калясніцы і бердышы.)

У год 1704. Сакавіка, дня 26 ранкам былі бачны тры сонцы, тое, што было з правага боку, згінула першым, а што на левым, то няхутка.

У год 1704. Ягамосць пан Дзялынскі, хельмінскі ваявода, ехаў паслом да цара ягамосці ў Рагудзёў. (Нарву – В.Т.), а пры ім 2500 чэлядзі.

У год 1704. Месяца мая 6 дня царскі палкоўнік Федасей Навумовіч і пры ім 2500 чалавек праводзілі на стругах грошы, напакаваныя ў мяшкі і бочкі.

У год 1704. У месяцы ліпені генерал ягавялікасці ягамосць пан Багдан Корсак і пры ім, пры Корсаку, два палкоўнікі, Рыгор Рыдванскі і пан Станкевіч, праводзілі трыма палкамі смаленскую пяхоту.

У год 1704. Месяца ліпеня, у дзень рускага свята Іллі, ліпеня дваццатага, была на небе пры захадзе сонца камета. Спачатку рухалася як куля, а потым гадзіны са дзве стаяла слупом.

Репозиторий ВГУ

У год 1704. Цар ягамосць узяў Нарву, або Ругадзеў. Пасля ўзяцця, загадаў усіх пасекчы.

У год 1704. Месяца кастрычніка 18 дня была ў Віцебску вялікая бура, з дамоў дахі пазносіла, на цэрквах крыжы паламала.

У год 1705. Месяца студзеня 15 дня ўехаў у Віцебск Барыс Пятровіч Шарамецьеў, фельдмаршал, а з ім дзевяць палкоў войска; сталі па гасподах.

У год 1705 . Месяца мая чацвёртага дня выйшла войска з Віцебска і стаяла ў полі тры дні, а потым пайшло ў Полацк. У гэты ж час праводжана з Парэчча ўніз 50 стругаў з ваеннымі прыпасамі: кулямі, гарматамі і бердышамі.

У год 1705. Цар ягамосць прыплыў да Лукішак і на чацвёрты дзень паплыў да Полацка Eodem anno mense iuli 11 die eclessia S. Isafia ipse oscicit 4 basilianos in Polocia і пасадзіў у Полацку камендanta. Як гэта было напісана, так тут яго я і перапісаў.

У год 1705 . Генерал Баўэр адабраў ад шведа Мітаву, Борск і Ліпаў, нямала там шведаў палажыў, а потым выйшаў з войскам у поле, мінамі гэтыя гарады ўзарваў і зруйнаваў і прыйшоў у Оршу.

У год 1706. Цар ягамосць, сабраўшы сваё войска ў Магілёве, пайшоў з ім пад Белую Царкву.

У год 1706. Выходзячы з Гародні, войска цара ягамосці патапіла ў Нёмане-рацэ порах, кулі і гарматы і прыйшло пад Белую Царкву.

У год 1706. Выгарала большая частка горада Вільні, ратуша, крамы. Святы Казімер і што ў склепах было замуравана, усё гэта патлела і пагінула. Чалавек з пяцьдзесят загінула і згарэла жыўцом. Гэты бок, млыны і за Спаскай брамай (так у тэксце – В.Т.)

У год 1707. Гатовыя грошы цара ягамосці з цла праводзілі на Барысаў, А валюнтарыст Сініцкі, іх пераняўшы, маскоўцаў, што была пры іх, пабіў, грошы забраў і ўцёк да Быхава.

У год 1707. Цар ягамосць Пётр Аляксеевіч аблажыў Быхаў, а потым быхаўцы здаліся і выдалі Сініцкага, якога з яго братам, акаванымі, праводзілі на Маскву.

У год 1707. Месяца мая ў Віцебску каля рынку згарэла 45 дамоў.

У год 1707. Месяца чэрвеня прыбыло 40 казакаў, узялі на паўтары бочкі жытняй мукі з дыма, а дзе выходзіла, і больш.

У год 1707. Валахі гетмана яго вяльможнасці ягамосці Рыгора Агінскага прыбылі ў Віцебск, старшына стала ў горадзе, а вайсковыя харугвы ў полі. Узялі з горада 60 тысяч злотых гатовымі грашыма, з архіепіскапскіх маёнткаў – 1120; бралі на Усвяце і па іншых каралеўскіх уладаннях.

У год 1707. Прыслалі з Полацка загад, каб з кожнага дыма далі па паўтары бочкі жытняй мукі. Мусілі даць і адвязлі да Полацка. І год 1707. Прыслалі з Менска загад, каб па Люблінскім тарыфе далі коней, з трох дымаў (так у тэксце – В.Т.) Горад і мяшчане мусілі даць 24 коней, далі і адаслалі да Мінска. А шляхта і ваявадзяне не далі нічога.

Репозиторий ВГУ

У год 1707. Для Быхава з другога боку Дзвіны выдалі правіянт: па дзве бочкі жыта, па два фунты масла, па чатыры фунты солі, па пяць фунтаў саланіны, па дзве бочкі аўса. А з гэтага боку Дзвіны далі для Себежа аднаму праклятаму капітану ўдзесяцёра больш, ён і Віцебск выпаліў. Гэты правіянт бралі з ваяводства.

У год 1707. Пан гарадскі пісар Боніч задобрыў у Копысі гатовымі грашыма Даўгарукага.

У год 1707. Маёмасць цара ягамосці праводжана праз Віцебск месяца бра (так у тэксце – В.Т.) дня 19 на Лукі, праводжана з Польшчы.

У год 1708. Барыс Пятровіч Шарамецьеў выбраў з віцебскіх мяшчан на сваё войска сем тысяч чэцвярцяў збожжа.

У год 1708. Месяца чэрвеня 12 дня ўся палкі выйшлі пад Лукішкі ў поле, а потым пайшлі да Чарэі.

У год 1708. На Дзвіне на стругах былі пастаўлены два масты, адзін насупраць пана Мірона Галузы, а другі насупраць Астаховіча. Потым гэтыя масты сплавілі ўніз.

У год 1708. Запоўнілі дзесяць стругаў хворымі салдатамі і адправілі ў Парэчча: для іх праводзінаў даў горад сто малайцоў.

У год 1708. Прыйшла ў Віцебск харугва смаленскай шляхты, выстаяўшы некалькі дзесяткаў тыдняў, пайшла ў Полацк.

У год 1708. 7000 мяшкоў жытняй мукі было прывезена з Полацка і складзена ў пунях паноў Галузы і Астаховіча.

У год 1708. У горадзе Віцебску ўзялі з мяшчан на шведскага наёмніка 6000 талераў, потым узялі з ратушы бурмістраў і дванаццаць другіх асоб і завялі іх да Астроўна, якіх адтуль выкупілі мяшчане, даўшы шведскаму дыпламату 1000 талераў бітых цалковымі.

У год 1708. Капітан Салаўёў – з 2500 конных казакаў і калмыкаў месяца верасня дваццаць восьмага дня выпаліў увесь Віцебск, замкі і горад, ратушу і крамы. Узгор'е, Заручаўе і Задунаўе, чатыры касцёлы і дваццаць цэркваў, а за Заручаўем узяў адкупнога – 600 талераў бітых. Ліхі. Ён жа з тымі ж казакамі раней выпаліў Магілёў, Быхаў, Дуброўна, Оршу і Кадзін, панскія дамы, нікога не шкадаваў.

У год 1708. Месяца лістапада ішло праз Віцебск са Смаленска 300 казакаў з капітанам Мерлінам; гэты ўзяў з горада і з мяшчан згоду – 600 талераў бітых.

У год 1708. Гэты ж капітан Мерлін, вяртаючыся з трыма дзесяткамі коннікаў, узяў з горада і мяшчан адкупнога – 600 талераў бітых.

У год 1708. Месяца бра ( так у тэксце – В.Т.) капітан Фёдар, прыбыўшы ў Віцебск, раставіў пошту да Полацка і да мяжы.

У год 1709. Месяца студзеня 7 дня на захадзе былі бачны тры сонцы.

У год 1709. Месяца студзеня 19 дня на поўдні былі бачны два слупы, а сонца было пасярэдзіне.

Гэтыя ўсе гісторыі перапісаны мною, Стафанам Гаўрылавічам Аверкам, мешчанінам віцебскім, слова ў слова з кніжкі ягамосці пана Міхала

Рэпазіторый ВДУ

Панцырнага, мешчаніна віцебскага, у Віцебску у год Божы 1760 месяца студзеня. .

Перапісана з кніжкі яго рукі, напісанай потым (так у тэксце – В.Т.), цяпер ізноў, у год 1768 месяца ліпеня дня 13, я, Стафан Аверка, выпісаў гэтую кнігу. А тут ізноў пачынаюцца гісторыі, пісаныя рукою ягамосці пана Гаўрылы Курылавіча Аверкі, віцебскага бурмістра і віцэландвойта, такім чынам:

Справы даўнейшыя, што дзеяліся ў Віцебску і на свеце, перапісаны з кніжкі Яна Чарноўскага і яго дзеда ў год 1733 месяца кастрычніка 25 дня.

У год Божы 1601. Быў голад і вялікія маразы.

У год 1602. Казакі высеклі Віцебск.

У год 1603. Быў вялікі паморак.

У год 1606. Быў рокаш і сумятні.

У год 1607. Цар Дзмітры ішоў на Маскву, на сталіцу, на царства.

У год 1609. Кароль Жыгімонт падышоў пад Смаленск, а на наступны год яго ўзяў.

У год 1614. Віцебск выгараў, і ў Глазовічах прайгралі бітву.

У год 1623. У Віцебску забілі ўладыку, блаславёнага Ёзафата.

У год 1653. Маскоўцы ўзялі Віцебск і другія замкі.

У год 1661. Аздобілі царкву Святога Духа.

У год 1667. Месяца сакавіка, другога дня, па старым календары, маскоўцы пакінулі Віцебск.

У год 1680. Месяца верасня 6 дня па старым календары згарэў горад, ратуша, крамы і касцёлы.

У год 1688. Месяца чэрвеня 17 дня была вялікая вада, якая ўсё пазатапляла.

У год 1708. Месяца чэрвеня семнаццатага дня цар Пётр Аляксеевіч выпаліў Віцебск.

У год 1733. Мая 31 па старомым календары, на восьмы дзень Божага Цела, ад вялебных айцоў бернардзінаў, якія рабілі арган і зайгралі на цэлы свет, выгараў Віцебск, рынак, крамы і цэрквы.

У год 1733. Лістапада 14 маскоўцы з Юры Мікітавічам Рэпніным увайшлі ў Віцебск.

У год 1710. Цэлы год лютаваў у Віцебску паморак.

У год 1737. У месяцы снежні дзевятага дня тысячу чатырыста талераў, якая належала з горада вялебным ксяндзам бернардзінам, выплацілі ксяндзу прыёру Восіпу Міхлерскаму.

У год 1736. У горадзе Віцебску на самым рынку віцебскія ксяндзы бернардзіны пачалі мураваць касцёл.

У год 1704. У месяцы ліпені 20 дня на святога рускага Іллю быў на набе знак, камета.

У год 1752. Месяца жніўня другога дня ад касцёла ксяндзоў дамініканцаў выгараў замак, плябанія, царква Благавешчання, езуіты і многа дамоў.



Репозиторий ВГУ

У год 1752. Месяца жніўня першага дня паздыхала ў Віцебску быдла, усе каровы.

У год 1743. Ксяндзы базыльяне пачалі мураваць царкву, старшым быў Юстын Чачкоўскі, а вікарыем – Дзюрдзя.

У год 1747. Месяца чэрвеня 11 дня, а 12 гадзіне дня, згарэла царква святога Яна Багаслова.

У год 1752. Сакавіка 16 на святога Андрэя Крыцкага, згарэла заручаўская царква Уваскрэсення.

У год 1757. Мая 12 дня, па-рускім календары выгарала Заручаўе і большая палавіна замка, тры царквы і два касцёлы.

У год 1757. Месяца чэрвеня 6 дня ад семінарыі пачаўся пажар, дагарэлі рэшткі замка і дах у касцёле айцоў езуітаў.

Да гэтага месца гісторыі напісаны шляхетна народжаным ягамосцем панам Гаўрылам Кірылавічам Аверкам, віцебскім бурмістрам і ландвойтам. Перапісаны яны тут яго сынам Стафанам Гаўрылавічам Аверкам у Божым 1768 годзе месяца ліпеня 13 дня па рускім календары. А тут ізноў пачынаюцца гісторыі, выпісаныя з розных прачытаных кніг Стафанам Гаўрылавічам Аверкам. Гэтыя гісторыі, як у якой кніжцы надрукаваны, так тут і выпісаны ў годзе 1768.

У годзе 1215 , На Ларэтанскім саборы атрымаў гнезненскі арцыбіскуп права на легацтва.

У год 1515 Ян Ласкі, гнезненскі арцыбіскуп, пацвердзіў гэтае права ў папы Льва.

А прымацыяльна, першым, яшчэ гнезненскі арцыбіскуп Мікалай Тромба на Канстанцінскім саборы, каб меў права і са сваімі спадкаемцамі на каралеўскую каранацыю. Піша Махавіта і Кромер пад годам 1446.

У год 1240. За Пудыкам, князем польскім, татары на вайне пад Кігніцай на Шлёнску, на месцы Bonus Kompus альбо Добрым полем званым,назжыналі ў палякаў, зжынаючы толькі па адным, дзевяць мяшкоў вушэй. А Длугаш піша, што толькі 6 мяшкоў было напакавана тымі вушамі.

У год 1150. Папа Інакенці IV праз свайго пасла Якуба, леадыйскага архідыякана, паслабіў палякам дзевяцітыднёвы пост у шасцітыднёвы і загадаў пасціць чатыры дні.

У Кракаве Маргарыта, жонка графа Вяшчбоўскага, за адным разам павіла трыццаць шэсць сыноў. Пішуць пісьменнікі і летапісцы Кромер, Длугаш, Бельскі. Testantur дня 21 студзеня, года 1629.

У год 1314. Камета прадказала ў Польшчы такі вялікі голад, што маткі дзецям не саступалі, а галодныя ваўкі – людзям. Бельскі, кніга 2. Длугаш, 3.

У год 13 3. На Святую Тройцу выпаў такі вялікі снег, ляжаў шэсць дзён і даў людзям надзеі на багатыя ўраджаі. Мехавіта, Длугаш, Бельскі.

У год 1381. Уладзіслаў, апольскі князь, праводзячы з Бежскага замка ў Аполе цудоўны абраз Найсвяцейшай Панны, справу рук святога Лукаша,

Репозиторий ВГУ

стаў на яснай гары як укопаны і не мог зрушыцца. Тут, прывёўшы з Венграў айцоў паўлінаў, заклаў іх кляштар. Длугаш. кніга .10.

У год Божы 1474. Любельскі ваявода, прызначаны ваяводам сандамірскім, справы такога вялікага ваяводства не мог ахапіць да гэтага часу. Піша Гербут.

У год 1499. У Кракаве, на вуліцы Святога Духа, нарадзіла белагаловая нежывое дзіця, у спіне якога, кусаючы і паядаючы цела, трымаўся жывы вуж , сведчыць Кромер.

У год 1410. Уладзіслаў Ягайла, польскі кароль, разбіў пад Грундвальдам крыжакоў, якіх было 140 000; 50 000 тысяч палягло, узяў 51 харугву і 40 000 у няволю. Магістр загінуў на поле бітвы. Кромер, кніга .16.

У год Божы 1514. Па ўзяцці Вены, Цэледын, маючы 80 000 войска, з многімі тысячамі і 25000 кайданоў пайшоў супраць палякаў, але на рацэ Крапіўне быў разбіты, страціў 24 000 войска, а 2000 і 27 палкаводцаў узята у няволю, сам Цэледын, закаваны ў кайданы, сядзеў у няволі ў Вільні. Палякаў палягло толькі 400. Піша Вапоўскі.

У год 1589. Ян Замойскі, канцлер і каронны гетман, узяў у няволю Максіміліяна, аўстрыйскага вялікага князя, прэтэндэнта па Польскую карону, толькі з заступніцтва папы, імператара і князёў быў адпушчаны.

У год 1605. Гетман Хадкевіч, маючы толькі 3 00 войска, разбіў у Інфлянтах 10 000 войска Карла Гудэрмана; 9000 паклаў трупамі і многа ўзяў да няволі; харугваў узята 60, гарматаў – II; сам Карл быў паранены на моры. Палякаў загінула не больш за 800. Бітва трывала тры гадзіны. Піша Пясецкі.

У год 1610. Гетман Жалкеўскі, маючы 600 войска, пайшоў супраць турка і, прыблізіўшыся пад Цацору, што каля Магілёва, разбіў 30 000 татараў. А тут пачалася між людзьмі звада, і па такому выпадку валахі, мультаны і туркі ўдарылі на палякаў. Жалкеўскаму, які меў 73 гады, галаву адсеклі; Канец польскага схапілі татары. Пасля гэтай перамогі татары рабавалі Падолле і Русь, бралі незлічонных нявольнікаў. галаву Жалкеўскага, насаджаную на кап'ё, адаслалі аж да Стамбула і насілі яе з вокрыкамі трыумфу. Піша Пясецкі.

У год 1621. За Жыгімонтам Трэцім палякі пад Хоцімам перамаглі турэцкага імператара Асмана.

У год 1526. Стафан Хмяльніцкі, маючы толькі 9 тысяч войска, забраў да няволі 50 татараў мірзаў і 1200 паспалітых жаўнераў. У Хмяльніцкага загінула 9 і 0 палонена. Піша Пясецкі.

У год 1621. Палякі пад Батавым прайгралі бітву. Загінулі польны гетман Каліноўскі і Марк Сабескі, брат польскага караля Яна III. Піша Пшыенскі.

У год 1628. У час кірмашу выгараў горад Яраслаў, дзе багатых купецкіх тавараў было страты на 10 мільёнаў залатых дукатаў. Піша Пясецкі.

У год 1635. Ад Каралевіча Уладзіслава, потым караля, Ежы Асалінскі, вілікі канцлер каронны, аддаючы ад імя манарха і цэлага каралеўства

subiectionem , пышна выправіў пасольства да папы Урбана VIII і прывёз каралю рэліквіі святых пакутнікаў Прымаса і Феліцыяна, бо нарадзіўся кароль у дзень іх свят. Піша Квяткевіч.

У год 1654. Пад Берастэчкам, калі гналі Хмяльніцкага, явіўся над польскім войскам у выглядзе перуновай стралы святы Міхаіл, палягло тут казакаў 30 тысяч, а астатнія пайшлі ўрассыпную. Піша Кахоўскі, Клімахт.

У год 1655. Шведскі кароль Карл, увайшоўшы ў Польшчу, калі выходзіў з Кракава ў Пазнань, убачыў цудоўны абраз, які каціўся па зямлі. Піша Кахоўскі.

У год 1657. У Польшчы лютаваў вялікі паморак, і так далёка, што ў самім Кракаве вымерла 36 тысяч людзей. не было ўжо каму і хаваць. Пішуць Кахоўскі, Клімахт, . .

У год 1650. Пад Гданьскам, у Аліўскім кляштары, падпісаны мірны дагавор палякаў са Швецыяй. Піша Кахоўскі.

Быў час фартуны для палякаў, бо на Марсавым полі пад Палонна разбіта 8 тысяч войска хоцімскага гетмана, узята 40 штук гарматаў, 148 харугваў з малымі стратамі палякаў, менавіта: 300 пяхоты і некалькі сотняў знатных асоб. Піша Кахоўскі.

У год Божы 1660. Татары з палкаводцамі Магаем і Цэлебулам, уварваўшыся праз замерзлую раку Віслу да Сандаміра, забілі 40 даміліканцаў і абата Садоцкага. У гэтым жа годзе нарадзіўся бык з дзьвюма галавамі, з сям’ю нагамі. У гэтым жа годзе на Шлёнску, між рэкамі Одрай і Нісай, падаў крывавы дождж. Пішуць летапісцы Кромер, Бельскі.

У год 1667. Пад Гайцам заключылі з татарамі і казакамі мір, якія. калі ішлі назад, спалілі трыццаць вёсак. Пад Гараевам пабіта Сільніцкім 21500 людзей. Піша Кахоўскі.

У год 1672. Туркі аблажылі Львоў, але, узяўшы сто тысяч талераў бітых цалковых водкупу, на свята святога Міхала адступілі.

У год 1673. Палякі разграмілі пад Хоцімам 30 тысяч туркаў. У гэты ж час знойдзена ў трупе турка 30 залатых дукатаў. Піша Кахоўскі.

У год 1675. 8 тысяч татараў і столькі ж туркаў, уварваўшыся да Польшчы, Мікулінцу, Падгайцы і Цярнопаль спустошыўшы, набралі нявольнікаў больш чым на дзвесце тысяч.

У год 1676, дня 3 лютага ўкаранаваны кароль польскі Ян III Сабескі.

Ян Сабескі, кароль польскі, ідучы пад Вену, атрымаў блаславенне ад львоўскага арцыбіскупа, а другое ў Кракаве ад папскага пасла і, стаўшы войскаў хрысціянскіх найвышэйшым правіцелем, разграміў пад Венай 54 тысячы туркаў, 44, як сведчаць Варыскі і Катубскі. Злучаны былі ў той вайне з каралём Янам князі-саксонцы, князь Карл Латарынгскі і Эмануіл, князь Баварскі. Стала гэтая вікторыя дня 12 верасня года 1683.

У год 1673. Гетман Ян Сабескі на свята святога Марціна, у дзень смерці караля Міхала, разграміў пад Хоцімам 60 тысяч туркаў.

Ян Сабескі, кароль польскі, памёр на Святую Тройцу, дня 7 чэрвеня года 1696, у той дзень і гадзіну, у які быў абраны каралём.

Репозиторий ВГУ

У год 1704. Шведы ўзялі вялікі польскі горад Пазнань; гэтыя ж самыя ўзялі Львоў.

Станіслаў Ляшчынскі абраны першы раз каралём, каранаваны дня 19 чэрвеня года 1704, а другі раз ўзноўлена элекцыя 12 верасня года 1713 года.

У год 1475. У Польшчы і на Русі было вельмі многа саранчы, на Русі многа, а ў Польшчы яшчэ больш.

У год 1536. Была вялікая, на палец, з галавой накшталт кажановай, саранча. Піша Мехавіта.

У год 1541. Калі была ў Польшчы саранча, вельмі падала і здыхала быдла.

У год 1542. Саранча велічынёй з локаць пакрыла Валашскую зямлю на дзве мілі, а каля Львова выпусташыла ўсё міль на шэсцьдзесят. Піша Квяткевіч.

У год 1660. З Белай Русі і з Літвы завітала саранча да Польшчы і Шлёнска, а ў годзе 1648 і ў годзе 1652 прынесла цяжкі голад. У годзе 1690 многа. але ў годзе 1711 на Падляшчы і Чырвонай Русі было саранчы яшчэ больш.

У год 1205. Быў у Польшчы вялікі паморак. Года 1211 скончыўся цяжкі трохгадовы. У год 1318. Быў паморак у Прусіі, Літве, Белай Русі і Віцебску.

У год 1358. Паморак за шэсць месяцаў вымарыў сапраўды палавіну палякаў, найбольш шляхты і багатых мышчан. У самім Кракаве вымерла 20 000 тысяч людзей. Сведчыць і піша Кромер.

У год 1424. Быў такі цяжкі паморак, што Уладзіслаў Ягайла з каралевай і князем Вітаўтам жылі ў лясах. Сведчыць Гербут. Года 1546. У Гданьску вымерла 40 тысяч, 36 тысяч пайшло у лясы, а звяр’ё ішло да вёскаў і гарадоў есці людскія трупы.Сведчыць Кахоўскі.

У год 1709. У Львове вымерла дзесяць тысяч людзей, адсюль лютаваў паморак у Польшы некалькі гадоў.

У год 1710. У Гданьску вымерла 26 тысяч, у Варме – 12 тысяч.

У год 1710. У Вільні вымерла 20 тысяч хрысціян, жыдоў – чатыры тысячы. У гэтым жа годзе лютаваў паморак і па іншых беларускіх гарадах. У годзе 1720 з’явіўся і ў горадзе Львове.

У год 1720. Быў у Польшчы вялікі голад. Трываў з вялікіх дажджоў тры гады. Сведчыць Кромер.

У год 1315 . З прычыны дажджоў і вялікай павадзі быў тры гады такі цяжкі паморак, што людзі, дзеці елі трупы, знятыя з шыбеніцаў. .Сведчыць Мехавіта.

У год 1404. Такі ж голад. Сведчыць Кромер і Длугаш.

У год 1 70. З прычыны доўгай і цяжкай зімы, людзі з лісця рабілі сабе ежу і елі трупы, ішлі у лясы на з’ядзенне звярам. На Белай Русі сабакі кідаліся на людзей і елі. Сведчыць Каяловіч.

У Вільні памёрла з голаду 15 тысяч людзей, а ў аднаго шляхціца збожжа абярнулася ў вужоў.

Репозиторий ВГУ

У год 1386. Лютага 12 дня кароль Ягайла, які пры святым крышчэнні быў названы Уладзіславам, злучыў Літву з Польскай Каронай.

Года 1597. На сейме, пад выглядам адшукання Інфлянтаў, Полацка, Смаленска, Віцебска, Кіева і іншых забраных Масквою гарадоў, аб'яўлена ёй вайна. Сам кароль Стафан Баторы пайшоў з войскам, здабыў Полацк, замак і цэлае ваяводства, якое гадоў 17 разам з Віцебскам было ў маскоўскіх руках.

У год 1686. З вялікай крыўдай і стратай для Рэчы Паспалітай заключаны пазнаньскім ваяводам Гжымультоўскім і канцлерам Агінскім дагаворы з Масквою, бо многія землі, набытыя польскаю крывёю, гарады Кіеў, Чарнігаў, Смаленск, Себеж з цэлымі ваяводствамі Маскве аддадзены.

Дасюль гісторыі сабраны і спісаны Стафанам Гаўрылавічам Аверкам, мешчанінам віцебскім у Віцебску, у годзе 1768, месяца ліпеня 13 дня.

А тут ніжэй выпісаў я і змясціў тыя рэчы, якіх няма ўпісана ў другіх асоб.

За імператарам Лявонам Ізаўрыкам вымерла ад паморка трыста тысяч людзей. У год 876, піша Стэнгеліюз, быў па ўсім свеце такі вялікі паморак, што ледзьве трэцяя частка людзей уратавалася ад смерці. Людныя чужаземскія гарады і нашы Кракаў, Варшаву, Вільню, Віцебск зрабіў паморак адной магілай, па паморку як вымела. Што да людзей, то ўсюды стала пуста.

А тут ніжэй змешчаны іншыя рэчы. Запісаў я тут імёны і прозвішчы паноў радных, якія у год 1597 сакавіка 17 дня былі першы раз абраны да наданай Віцебскаму гораду майдыберыі.

Войт Аляксандр Корвін Сухосаў, стараста веліжскі, сакратар яго каралеўскай міласці.

Ландвойт Захар Волк, мешчанін віцебскі.

Бурмістр Іван Гаўрылавіч Клыха. Бурмістр Васіль Сымонавіч Веліжанін. Бурмістр Васіль Іллініч Танко. Бурмістр Іван Ісікавіч Андронаўскі, Райца Канстанты Хамініч Стузакоўскі. Райца Сергій Пятровіч Зататай. Райца Лаўрын Хадкевіч Галуза. Райца Міхайла Колес. Райца Фёдар Стафанавіч Спіца. Райца Восіп Гаўрылавіч Клыха. Райца Якім Юр'евіч Шаўра.

Лаўнік Кузьма Іванавіч Комаса.

Лаўнік Багдан Якімавіч Пекуча.

Лаўнік Фёдар Сымонавіч Вяртошка.

Лаўнік Багдан Сыдзкевіч.

Лаўнік Іван Гутар.

Лаўнік Восіп Нікіфаравіч Шаўра.

Лаўнік Іван Ісакавіч Самуйлаў.

Лаўнік Даніла Рыгоравіч Шчулка.

Гэтыя шаноўныя мяшчане былі абраны да ўпершыню наданай гораду рады за панаваннем найяснейшага манарха пана наўшага міласцівага Жыгімонта Трэцяга ў год 1597 месяца сакавіка 17 дня.

Репозиторий ВГУ

Даўгі, якія былі перад гэтым на ўвесь горад Віцебск, змяшчаю я тут са старога рэестрыку, напісанага рукою ягамосці пана Боніча, пісара гарадскога віцебскага.

1. Віцебскім бернардзінцам талераў бітых 1750.

2. Вяльможным віцебскім панам базыльянам талераў бітых 1677.

3. Ягамосцю пану Альшэўскаму талераў бітых 500.

4. Ягамосцю пану Лубашчынскаму талераў бітых 770.

5. Ягамосцю пану Рамшы талераў бітых 100.

6 . Ягамосцю пану Каржанеўскаму талераў бітых 50.

7. Розным панам, віцебскім мяшчанам і купцам талераў бітых 1000. Сума разам 5247.

Уся гэтая сума, названая вышэй, згаданым іх мосцям вернута і выплачана, а скасаваныя аблігацыі і дакументы маюцца і знаходзяцца ў ягамосці пана Яна Ігольніка, віцебскага бурмістра. Гэтае паведамленне ўпісана сюды ў годзе 1768, а тут змяшчаю я імёны, сабраныя ў адно з вялікай цяжкасцю, хто і калі быў ваяводам віцебскім.

Януш Касцевіч, ваявода віцебскі. Быў абраны ваяводам у год 1516, жніўня 7 дня.

Іван Багдановіч, ваявода віцебскі. быў ваяводам у годзе 1551.

Станіслаў Кішка. Быў ваяводам віцебскім у год 1552.

Стафан Андрэевіч Збаражскі. Быў ваяводам у год Божы 1561.

Мікалай Паўлавіч Сапега. Быў ваяводам віцебскім у год 1591. З ласкі гэтага ваяводы і магдэбургія дадзена ад караля ягамосці Жыгімонта Трэцяга ў годзе 1597.

Ян Завіша. Быў ваяводам віцебскім у год 1600.

Ян Ракоўскі. Быў ваяводам у год 1614.

Сымон Самуіл Сангушка. Быў ваяводам у год Божы 1633.

Крыштоф Кішка. Быў ваяводам у год 1641.

Станіслаў Валовіч, польны гетман Вялікага княства Літоўскага. Быў ваяводам віцебскім у год 1663.

Ян Антоні Храпавіцкі, ваявода віцебскі. Быў ваяводам у год 1683.

Леанард ці Лявон Пацей. Быў ваяводам віцебскім у год 1668.

Андрэй Крышпін. быў ваяводам віцебскім у год 1695, ваявода віцебскі.

Казімір Аляксандр Пацей, быў ваяводам віцебскім у год 1701.

Марцыян Міхал Агінскі быў ваяводам віцебскім у год 1730.

Восіп Салагуб, няхай шчасліва жыве і цяпер, ваявода віцебскі. Стаў на ваяводства віцебскае ў год 1753.

Усе ваяводы, яснавяльможныя паны нашы, тут сабраны, толькі ніяк не знайшоў я пецярых. Хоць і з цяжкасцю, але імёны розных асоб, жывых і памерлых, упісаны тут у годзе 1768 месяца ліпеня.

Яснавяльможны ягамосць пан Марцян Агінскі памёр у год 1750 красавіка 1 дня.

Пані Зоф'я Пёрава, ландвойтава віцебская, жонка Антоні Пёрава памерла ў годзе 1750 лютага … дня.

Репозиторий ВГУ

Пані Тэрэза Пацеева, троцкая ваявадзіха памёрла ў год 1749 ... 18 дня.

Ксёнз Люцыд Аверка Z S B W ( памёр – В.Т.) у Любавіцкім кляштарны ў год 1749 кастрычніка 4 дня.

Ягамосць пан Гаўрыла Кірылавіч Аверка, віцебскі бурмістр, і віцэландвойт, памёр у год 1759 месяца кастрычніка 18 дня па-рускім календары.

У год 1755 .Месяца лютага 22 памёр пан Рыгор Пырскі, бурмістр віцебскі.

У год 1755 . Сакавіка 7 дня памёр пан Якуб Сухар.

Года 1753. Месяца студзеня 29 яснавяльможны ягамосць пан Восіп Давойна ўехаў на віцебскае ваяводства.

Вяльможны ягамосць пан Сымон Мількевіч прысягнуў на ландвойтаўства ў год 1750, ліпеня 7 дня, памёр у год 1768.

Ягамосць пан Мацей Галуза прысягнуў быць бурмістрам у год 1750 7 дня.

Ягамосць пан Сяргей Сіпко прысягнуў быць бурмістрам у год 1750 17 ліпеня; памёр у год 1767.

У год 1750. 1 сакавіка, памёр ягамосць пан Восіп Маркаў, бурмістр віцебскі.

Пан Дзмітры Аверка памёр у год 1686 чэрвеня 19 дня.

Пан Пётр Аверка памёр у год 1718 мая 12 дня.

Пан Лявон Свіршчэўскі памёр у год 1709.

Пан Мірон Галуза памёр у год 1720 мая 4 дня.

Пан Мірон Лагошны памёр у год 1724 сакавіка 24 дня.

Пан Аўрам Ярашэвіч памёр у год 1725 чэрвеня 6 дня.

Пан Курыла Аверка памёр у год 1727 кастрычніка 30 дня.

Пані Еўдакія Аверкава памерла ў год 1728 ...бра (так у тэксце – В.Т.) 23 дня.

Пан Аўдакім Грыгораў памёр у год 1729 жніўня 13 дня.

Ксёндз Юстын Ліцвінка памёр у год 1732 лютага 27 дня.

Ксёндз Гальяш, базыльян, утапіўся ў год 1732 у аўторак, на Каляды.

Ксёндз Гаўрыла Быкоўскі, базыльян, памёр у год 1732.

Пан Амелянік памёр у год 1732...гбра. (так у тэксце – В.Т.) ..11 дня.

Пан Мацей Амелянік памёр у год 1732 жніўня 18 дня.

Пан Ян Боніч памёр у год 1733 мая 14 дня, на Тройцу.

Пан Андрэй Лапа памёр у год 1732 5 жніўня.

Пан Казімір Мушчынка памёр у год 1735 у Полацку дня 25 ліпеня.

Пан Цімафей Мушчынка памёр у год 1735 21 студзеня.

Пані Хадора Лагошна памёрла ў год 1735 24 чэрвеня.

Пан Мушчынка Якуб памёр у годзе 1737 7 красавіка.

Гэта перапісаў Стафан Гаўрылавіч Аверка.

Репозиторий ВГУ

## IX. ПЫТАННІ ДЛЯ САМАКАНТРОЛЮ ПА ТЭМЕ "ГАРАДСКОЕ ЛЕТАПІСАННЕ: "ВІЦЕБСКІ ЛЕТАПІС М.ПАНЦАРНАГА І С.АВЕРКІ"

1. Назавіце гарадскія летапісы Беларусі, іх аўтараў, час узнікнення.
2. Акрэсліце структуру "Віцебскага летапісу М.Панцырнага і С.Аверкі".
3. Як вы разумееце паняцце "кампіляцыя" у дачыненні да "Віцебскага летапісу М.Панцырнага і С.Аверкі".
4. Назавіце іншаземных аўтараў, летапісцаў і храністаў на працы якіх спасялаецца С.Аверка.
5. Якія гістарычныя недакладнасці дапушчаны ў "Віцебскім летапісе".
6. Легенды пра заснаванне якіх гарадоў змешчаны ў "Віцебскім летапісе".
7. Пра што расказваецца ў летапіснай часцы "Перапісана з рускіх хронік".
8. На якой мове былі напісаны гарадскія летапісы Беларусі.
9. У якіх беларускіх друкаванных выданнях змешчаны гарадскія летапісы.
10. Якія персанажы гарадскіх летапісаў сталі героямі мастацкіх твораў.

## X. ЛІТАРАТУРА


1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI - першая палова XVIII стагоддзя. Мн., 2003.
2. Беларускія летапісы і хронікі. Мн., 1997.
3. Библия. Книги священного писания Ветхого и Нового Завета. Канонические. М., 1994.
4. Гісторыя беларускай дакастрычніцкай літаратуры: У 2 Т. Т.1. Мн., 1968.
5. Златоструй. Древняя Русь X-XIII веков. М., 1990.
6. Кусков В.В. История древнерусской литературы. М., 1989.
7. Кніга жыцій і хаджэнняў. Мн., 1994.
8. Лихачёв Д.С. Развитие русской литературы X-XVII веков. Эпохи и стили. Л., 1973.
9. Мальдзіс А.А. Беларусь у люстэрку мемуарнай літаратуры XVIII ст. Мн., 1982.
10. Pasek Jan Chryzastom. Pamiętniki. Warszawa, 1987.
11. Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975.
12. Помнікі мемуарнай літаратуры XVII ст. Мн., 1983.
13. Полное собрание русских летописей. М., 1975. Т.32.
14. Полное собрание русских летописей. М., 1980. Т.35
15. Старажытная беларуская літаратура. Зборнік. Мн., 1990.


Репозиторий ВГУ